WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 МАЯ 2010 г.
СУБОТА
№ 93
(26701)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

У НЯДЗЕЛЮ МОЦНЫЯ ДАЖДЖЫ

У суботу і нядзелю, паведаміла рэдакцыі **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА,** амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальнiцамі. Тэмпература ўначы 9—16, удзень у суботу 18—24, у нядзелю стане больш воблачна і таму ўжо 16—23 градусы. У Брэсцкай і Гомельскай абласцях у нядзелю чакаюцца даволі моцныя дажджы, месцамі магчыма ўзмацненне ветру да 15—18 м/с. У пачатку наступнага тыдня дажджоў стане больш, яны будуць мацнейшымі, месцамі з навальнiцамі. У панядзелак уначы 10—17, удзень — 15—22, на ўсходзе краіны да 25 цяпла. Вільготнае надвор'е захаваецца ў аўторак, сераду і чацвер, аднак дажджы будуць ужо не такімі моцнымі і не паўсюдна. Тэмпература ўдзень 18—20 мая — 16—21 градус, на ўсходзе да 24 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ ПАВІННА ПАВЯЛІЧЫЦЬ ЭКСПАРТ ЛЕКАВЫХ ПРЭПАРАТАЎ»

Беларусь павінна істотна знізіць залежнасць ад імпарту ў сферы фармацэўтыкі. Адначасова павінен значна ўзрасці экспарт беларускіх лякарстваў. Такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падчас нарады па актуальных пытаннях развіцця айчыннай фармацэўтычнай галіны.

«Неабходна падтрымліваць разумны баланс паміж імпартам і ўласнай вытворчасцю ў гэтай сферы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Задача складаецца ў тым, каб не толькі навучыць нашу фармацэўтычную прамысловасць і медыцыну аператыўна рэагаваць на ўзнікаючыя эпідэмічныя пагрозы, але і папярэджваць паніку, не дапускаць падняцця цэнаў на лякарствы, максімальна задавольваць попыт насельніцтва на медыкаменты», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Мэтазгоднасць такога падыходу дыктуецца інтарэсамі грамадзян Беларусі, неабходнасцю аховы іх здароўя і зніжэння расходаў на лякарствы». «А па-другое, гэта матывавана інтарэсамі дзяржавы: эканоміяй валютных сродкаў, рацыянальным расходаваннем бюджэту, падтрымкай нацыянальных таваравытворцаў», — дадаў ён. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ёмістасць беларускага лекавага рынку перавышае $600 млн у год. Цяпер амаль 80 працэнтаў гэтага рынку ў вартасным выражэнні складаюць замежныя прэпараты. «Хоць у развітых краінах аптымальнымі суадносінамі лічыцца 50х50», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Яшчэ горш ідуць справы з выхадам беларускай лекавай прадукцыі на знешнія рынкі. «Гаварыць пра аб'ём экспарту ўсёй фармацэўтычнай прамысловасці краіны ў $70-75 млн проста сорамна, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Таксама не сур'ёзна прыкрывацца тэмпамі росту вытворчасці ў 110-111 працэнтаў, калі доля айчынных лякарстваў на ўнутраным рынку не перавышае 20 працэнтаў. Гэта проста мізэр, улічваючы магчымасці канцэрна «Белбіяфарм» і актыўны пакупніцкі попыт на такую прадукцыю». Прэзідэнт адзначыў, што перавага імпарту ў фармацэўтыцы тоіць у сабе пагрозу як з эканамічнага пункту гледжання, так і з пазіцыі нацыянальнай бяспекі (рызыка недастатковага забеспячэння людзей неабходнымі лякарствамі). Аляксандр Лукашэнка даручыў развіваць у Беларусі вытворчасць лекавых субстанцый (сёння з 618 субстанцый, якія прымяняюцца ў краіне, толькі 49 — айчынныя). У агульным аб'ёме беларускага фармацэўтычнага рынку доля айчынных прэпаратаў павінна быць даведзена як мінімум да 50 працэнтаў. Пры гэтым лякарствы беларускай вытворчасці не павінны расці ў цане і адначасова павінны быць гарантавана высокай якасці, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт даручыў у найбліжэйшы час распрацаваць стратэгію лекавай бяспекі Беларусі, каб краіна не была ў крытычнай залежнасці ад імпарту ў перыяды эпідэмій і пандэмій. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў нарошчваць аб'ёмы фармацэўтычнага экспарту. Напрыклад, на нарадзе было адзначана, што гэты від экспарту з Беларусі ў Расію складае каля $40 млн, пры тым што расійскі рынак лекавых таварaў — $15 млрд. На замежных рынках відавочная прастора для беларускіх экспарцёраў. Акрамя таго, Прэзідэнтам было даручана падрабязна вывучыць пытанне падрыхтоўкі ў Беларусі высокакваліфікаваных спецыялістаў-фармаколагаў, каб палепшыць кадравае забеспячэнне айчыннай навукі ў галіне. Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў Камітэту дзяржкантролю ўважліва праверыць, як ажыццяўляюцца закупкі імпартных медыцынскіх прэпаратаў і абсталявання. Даклад аб гэтым павінен быць прадстаўлены кіраўніку дзяржавы да канца мая.

СТАБІЛЬНАСЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВАЛЮТЫ БУДЗЕ ЗАХОЎВАЦЦА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 14 мая прыняў са справаздачай Старшыню праўлення Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча.

Кіраўніку дзяржавы паведамілі, што ўсе асноўныя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі за 4 месяцы выкананыя ў поўным аб'ёме, дасягнутая стабілізацыя на фінансавых рынках. Паводле слоў Пятра Пракаповіча, асабліва важна, што сёлета захоўваецца стабільнасць курса нацыянальнай валюты. Фактычна на сёння ў параўнанні з пачаткам года гэты паказчык да кошыка з трох замежных валют застаецца нязменным, пры тым, што назіраюцца рэзкія ваганні ўнутры кошыка паміж еўра і доларам. У першым квартале ў краіне палепшылася сітуацыя з экспартам тавараў і паслуг, які павялічыўся на 29 % у параўнанні з такім жа перыядам мінулага года. У краіну паступіла валютнай выручкі на $455 млн, больш чым у першым квартале 2009 года. Як вынік, узраслі золатавалютныя рэзервы, якія па стане на 1 мая складаюць у нацыянальным вызначэнні $6 млрд 515 млн. Гэта амаль на $550 млн больш, чым было на 1 студзеня гэтага года. Такая тэндэнцыя ўмацоўвае ўпэўненасць, што стабільнасць нацыянальнай валюты будзе захоўвацца, паколькі яна грунтуецца на вынiках работы эканомікі, якія паляпшаюцца. Кіраўнік Нацыянальнага банка праінфармаваў Прэзідэнта, што крэдытаванне эканомікі ідзе ў поўным аб'ёме, прычым на эфектыўныя праекты. Паводле яго слоў, на 1 мая запазычанасць па крэдытах рэальнага сектара эканомікі ўжо дасягнула Br71 трлн, і ў параўнанні з 1 мая 2009 года адзначаецца рост крэдытнай запазычанасці на 32 %.

Важна, што цяпер ёсць магчымасці і ў банкаўскай сістэмы для павелічэння крэдытавання. Упершыню за апошнія паўтара года фактычна дасягнутая дастатковая ліквіднасць банкаўскай сістэмы. Пётр Пракаповіч падкрэсліў важнасць таго, што ўсе банкі пачалі выконваць рэкамендацыі Нацыянальнага банка па зніжэнні працэнтных ставак. У прыватнасці, працэнтныя стаўкі па новавыдадзеных крэдытах у сакавіку зменшыліся ў параўнанні з лютым на 1,1 %. Кіраўнік Нацбанка выказаў спадзяванне, што рэкамендацыі па выхадзе ставак па крэдытах на ўзровень 15 % у чэрвені будуць забяспечаныя. Такім чынам, будзе завершана работа па дасягненні такога ж узроўню працэнтных ставак па крэдытах, якія былі ў дакрызісны перыяд — стаўка рэфінансавання плюс 3 %.

У гэтым годзе тройчы зніжалася стаўка рэфінансавання, і цяпер яна складае 12 %, што адпавядае рамкам калідора, які намечаны Асноўнымі накірункамі крэдытна-грашовай палітыкі.

На думку Пятра Пракаповіча, спраўна працуе плацежная сістэма — без збояў і парушэнняў. Плацяжы штодзень ажыццяўляюцца ў рэжыме рэальнага часу і іх праведзена на 13 % больш, чым у мінулым годзе. Гэта сведчыць пра ажыўленне эканамічнай дзейнасці суб'ектаў гаспадарання.

Такім чынам, захоўваюцца параметры па ўсіх асноўных кірунках дзейнасці Нацыянальнага банка, якія патрэбныя для забеспячэння работы рэальнага сектара эканомікі.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў, каб усе паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі па вынiках работы за паўгоддзе і за год былі безумоўна выкананыя.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»
24 мая 2010 года состоится

ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Жабинковский сахарный завод», расположенного по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина.

Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, зал заседаний заводоуправления ОАО «Жабинковский сахарный завод».

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:
Об увеличении уставного фонда Общества.
О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник—пятница) начиная с 14.05.2010 г. по 23.05.2010 г. по месту нахождения Общества г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 24 мая 2010 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 24 мая 2010 года, 13.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 17 мая 2010 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНН 200037600

ПРАКАВЕТНАЕ

Ляцела страла ўздоўж сяла

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УВЕТКАЎСКІМ раёне адбыўся старажытны традыцыйны абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы». Звычайна яго называюць каротка «пахаванне стралы». Несумненна, гэта ўнікальны помнік нематэрыяльнай (духоўнай) культуры беларусаў Пасожжа. Больш «стралы» нідзе няма. Дагэтуль захаваны звычай і вераванне ў моц прыроды, зварот да яе праз песню.

— Страла павінна гучаць, — кажуць і жыхары вёсак, і спецыялісты этнафоніі — фалькларысты. Яны лічаць спевы «стралы» найвышэйшым узроўнем народнага выканальніцкага мастацтва. Нягледзячы на тое, што часам дождж паліваў, як з вядра, «стралу» вадзілі ў вёсках Стаўбун і Неглюбка, вадзілі танок — карагод і спявалі, і хавалі яе, як і належыць, у жытнёвым полі.

СТАР. 3

Сёння — Дзень сям'і

ВОДПУСК «НА РОДЫ» МОЖА СТАЦЬ БОЛЬШЫМ

А вось пытанне «падатку на бяздзетнасць» не разглядаецца

Сяргей ГРЫБ

Павелічэнне дапамог на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў і больш прывабныя ўмовы забеспячэння бясплатным харчаваннем дзяцей да 2 гадоў у маламаёмных сем'ях, новыя правілы адраснай сацыяльнай дапамогі, нарэшце, падтрымка ў вырашэнні жыллёвых праблем. Варта пагадзіцца, што ўсё гэта паўплывала адразу на дзве акалічнасці — змяншэнне колькасці скасаванняў шлюбаў і павелічэнне нараджальнасці. Праўда, таксама не сакрэт: паказчыкі той жа нараджальнасці ўзрасталі летась, сёлета сітуацыя стала змяняцца і, на жаль, не ў лепшы бок. А адсюль — і павышаная цікавасць да інтэрактыўнай канферэнцыі «Дзяржаўная сацыяльная падтрымка сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей», якая была наладжана Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны з нагоды Дня сям'і. Такім чынам, мы прапануем пазнаёміцца з найбольш цікавымі пытаннямі, адказы на якія далі першы намеснік міністра Пётр ГРУШНІК, начальнік аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Марына АРЦЁМЕНКА, кансультант гэтага ж аддзела Святлана БЕЛАШ, а таксама начальнік аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання Таццяна ФЁДАРАВА.

@ Не сакрэт, што ў свой час актыўна абмяркоўвалася тэма павелічэння водпуску па цяжарнасці. Якім будзе вынік гэтых абмеркаванняў?

— Так, падобнае пытанне ўзнімалася, прычым у Беларусі сапраўды плануецца павелічэнне дародавага водпуску і дазвол на яго з 28 тыдняў цяжарнасці. Гэта мэтазгодна перш-наперш таму, што значнай частцы жанчын на апошніх тэрмінах цяжарнасці, як правіла, выдаецца лісток непрацаздольнасці ў сувязі з тымі або іншымі ўскладненнямі. Таму цяпер уносяцца адпаведныя змяненні ў Працоўны кодэкс. І мы спадзяёмся, што гэтая прапанова будзе падтрыманая на ўсіх узроўнях.

@ Даводзілася чуць пра намеры разгледзець пытанне аб увядзенні ў нашай краіне «мацярынскага капіталу». Ці плануюцца тут канкрэтныя рашэнні?

— У Беларусі мэтанакіравана рымаюцца рашэнні, скіраваныя на большую падтрымку сем'яў з дзецьмі. У прыватнасці, у 2007 годзе аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці вызначана ў 5, а пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — у 7 бюджэтаў пражыткавага мінімуму. Паступова павышаліся і штомесячныя дапамогі на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — з 1 студзеня гэтага года памер такой дапамогі адпавядае БПМ.

Пры гэтым з улікам зацікаўленасці дзяржавы ў нараджэнні ў сем'ях менавіта другіх дзяцей пытанне ўвядзення такога стымулу, як «мацярынскі» або «сямейны» капітал, заслугоўвае ўвагі. Аднак разам з тым гэта пытанне неабходна дэталёва прапрацаваць як з пункту гледжання парадку і ўмоў аказання падобнай падтрымкі, так і з пункту гледжання фінансавых магчымасцяў дзяржавы. Бо толькі па папярэдніх разліках пры прызначэнні «мацярынскага» («сямейнага») капіталу ў такіх памерах, як у той жа Расіі (10 тысяч долараў), спатрэбіцца больш за 1,5 трлн рублёў.

Словам, тут трэба ўзважыць усе акалічнасці. Пытанне ўзмацнення падтрымкі сем'яў з дзецьмі, і ў тым ліку магчымасць увядзення аналагічнай «мацярынскаму» капіталу выплаты плануецца разгледзець у рамках падрыхтоўкі Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі, праграмы «Дзеці Беларусі» на 2011—2015 гады.

@ Рашэнне аб павелічэнні дапамогі па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў да бюджэту пражыткавага мінімуму было, безумоўна, правільным. І разам з тым зразумела: жыць на гэтыя грошы выпадае не толькі дзіцяці, але і яго маці. Такім чынам, ці не варта падумаць аб павышэнні дапамогі да 2 БПМ?

— Безумоўна, памер дапамогі на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў не застанецца нейкай статычнай нормай, у перспектыве яна будзе разглядацца. Варта паўтарыцца, што цяпер ідзе работа над праектам Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2011—2015 гады, у якой будуць прадугледжаныя меры па стымуляванні нараджальнасці. І ў тым ліку гаворка ідзе пра дапамогі на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — плануецца прапрацаваць пытанне вызначэння гэтай дапамогі зыходзячы з сярэдняй зарплаты.

@ Патлумачце, на якую падтрымку можа разлічваць адзінокая маці, якае мае малое дзіця?

— «Базавая» штомесячная дапамога на догляд дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў такім маці выплачваецца з надбаўкай. Да дасягнення дзіцем узросту 1,5 года падобная надбаўка вызначана ў 75, а ад 1,5 да 3 гадоў — у 40 працэнтаў. Сёння памеры гэтых дапамог складаюць 465 900 і 372 720 рублёў адпаведна.

@ Ці захаваецца дапамога на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў за жанчынай, якая збіраецца часова, на паўгода, выехаць да сваякоў ва Украіну?

— Паводле заканадаўства, у выпадку выезду дзяцей за межы Беларусі тэрмінам больш чым на 2 месяцы выплата дапамогі спыняецца — на час знаходжання за мяжой. Аднак падобнае абмежаванне не датычыцца жанчын, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці. Калі жанчына знаходзіцца ў працоўных адносінах і выйшла ў водпуск па доглядзе дзіцяці, яна будзе мець права на дапамогу незалежна ад факта пражывання на тэрыторыі нашай краіны.

@ Калі дапамога на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў можа зменшыцца на 50 працэнтаў?

— Такое можа адбыцца ў двух выпадках. Па-першае, калі маці выходзіць на працу больш чым на палову стаўкі, і, па-другое, калі дзіця афармляецца ва ўстанову дашкольнай адукацыі, так званы дзіцячы садок.

@ Датэрмінова перапыніла водпуск па доглядзе і выйшла на працу, але зразумела, што зрабіла памылку: дзіця, якому цяпер 2 гады, вельмі шмат хварэе. Ці магчыма вярнуцца ў водпуск па доглядзе зноў?

— Магчыма. Паводле Працоўнага кодэкса, водпуск па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў даецца па пісьмовай заяве маці і можа быць выкарыстаны ёй цалкамі або па частках любой працягласці. Такім чынам, да 3-гадовага ўзросту дзіцяці вы можаце вярнуцца ў водпуск у любы момант — для гэтага неабходна толькі зноў жа напісаць наймальніку заяву. Прычым калі дзіця не аформленае ў дашкольную ўстанову, то пасля такога вяртання выплата дапамогі будзе рабіцца ў поўным памеры.

@ Збіраюся выйсці на працу, і ў сувязі з гэтым пытанне: ці можна аформіць догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў на мужа, які нідзе афіцыйна не працуе? Ці будуць мужу выплачваць дапамогу і ці трэба яму зарэгістравацца ў службе занятасці?

— Водпуск па доглядзе дзіцяці да 3-гадовага ўзросту можа давацца працуючаму бацьку, апекуну або іншым сваякам, якія фактычна здзяйсняюць такі догляд. Адпаведна, такога права ў непрацуючага бацькі (і ў тым ліку, калі ён будзе зарэгістраваны беспрацоўным) няма.

@ Дзіцяці толькі 4 месяцы, даходы сям'і — толькі дапамога і зарплата мужа крыху больш чым 200 тысяч рублёў. Ці можам мы разлічваць на бясплатнае дзіцячае харчаванне?

— Па прызначэнне бясплатнага харчавання на дзіця ва ўзросце да 2 гадоў трэба звяртацца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства. Гэты від матэрыяльнай падтрымкі прызначаецца з даты выпіскі рэцэпта ўчастковым урачом-педыятрам тэрмінам на 6 месяцаў.

Бясплатным харчаваннем дзіця ва ўзросце да 2 гадоў забяспечваецца ў выпадку, калі сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае бюджэт пражыткавага мінімуму — 266 230 рублёў. Сам сукупны даход разлічваецца за 6 папярэдніх перад зваротам месяцаў. Пры гэтым трэба звярнуць увагу: у сукупным даходзе сям'і не ўлічваюцца аднаразовая дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці і «захвочвальная» дапамога маці, якая стала на ўлік у дзяржаўнай «жаночай кансультацыі» да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці.

СТАР. 2

МАЛАКО І МЯСА ПАДАРАЖЭЮЦЬ

Згодна з пастановай Мінэканомікі, павышаюцца гранічныя адпускныя цэны на малако, кефір, смятану, тварог, ялавічыну патушную і свініну патушную.

Так, паводле звестак прэс-службы міністэрства, на малако, кефір, смятану і тварог яны павялічацца на 2 працэнты, на ялавічыну патушную — на 3, свініну патушную — на 2 працэнты. Як адзначаюць у Мінэканомікі, адпаведнае рашэнне прынятае па прапанове Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання ў мэтах паэтапнай кампенсацыі падаражэння малочнай і мясной сыравіны ў сувязі з павелічэннем закупачных цэнаў на малако, буйную рагатую жывёлу і свіней.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НОВАЕ ПАЎСТАННЕ КАРДЫНУЕЦЦА З МАСКВЫ?

Пра гэта заявіла кіраўнік часовага ўрада гэтай краіны Роза Атунбаева.



«Учора ўзброеныя бакіеўскія паплечнікі папрабавалі захапіць адміністрацыі трох абласцей — Ошскай, Джалал-Абадскай і Баткенскай.... План у іх быў дакладны, распрацаваны. На жаль, яны дзейнічаюць з цэнтрам з Масквы», — сказала Атунбаева ў інтэрвью «Эха Масквы».

НА АЛЬБІЁНЕ З РАБОТАЙ ТУМАННА

Колькасць беспрацоўных у Вялікабрытаніі павялічылася за першы квартал гэтага года на 53 тыс. чалавек і дасягнула рэкорднага з 1994 года ўзроўню — 2,51 млн, паведаміла брытанскае Упраўленне нацыянальнай статыстыкі. Такім чынам узровень беспрацоўя на сёння па краіне склаў 8 працэнтаў.

У РАСІІ МНОГІХ ВЕТЭРАНАЎ ПАДМАНУЛІ З КВАТЭРАМІ ДА СВЯТА

«Сітуацыя з кватэрамі для расійскіх ветэранаў насамрэч не такая аптымістычная, — піша «Новая газета». — Губернатары маўчаць як пра тых ветэранаў, якія засталіся за бортам прэзідэнцкай праграмы, так і пра тыя кватэры, у якія засяліліся «шчаслівучыкі». Так, на ўсіх бескватэрных франтавікоў сродкаў не хапіла, але чыноўнікі ў рэгіёнах знайшлі выйсце, адмовіўшы пэўнай частцы ўдзельнікаў і інвалідаў вайны пад рознымі нагодамі. Тым жа, хто ў праграму ў выніку патрапіў, жыллоплошча прапануецца пераважна ў аддаленых раёнах горада, а часам і ў прыгарадах. Нярэдка кватэры даюць на апошніх паверхах новабудоўляў, дзе не працуюць ліфты. Ветэраны паведамляюць пра тое, што ім даюць кватэры не толькі без шпалераў, але нават без унітазаў, ракавін, кранаў і газавых пліт».

БАБРУЙЧАНІНА АСУДЗІЛІ ЗА РАНЕННЕ ЗНАЁМАГА ПА ЯГО Ж ПРОСЬБЕ

Малады чалавек 1988 года нараджэння абвінавачваўся ў тым, што ў студзені гэтага года ў кватэры пацярпелага параніў яго нажом у жывот, нанёс цяжкае цялеснае пашкоджанне. Аднак зрабіў ён гэта па просьбе самога пацярпелага. Той спадзяваўся такім чынам выклікаць жаль у сваёй жонкі, каб яна да яго вярнулася. Суд прызначыў 4 гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

ЗЛАЧЫНЦЫ, ЯКІЯ ЎЧЫНІЛІ ТРАЙНОЕ ЗАБОЙСТВА Ў ГРОДНЕ, ПРЫГАВОРАНЫЯ ДА РАССТРЭЛУ

Суддзя абласнога суда вынес прысуд аб прымяненні выключнай меры пакарання (расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці) да двух гродзенцаў, якія ў кастрычніку 2009 года ў Гродне забілі дзвюх жанчын і мужчыну, выкралі сына забітай, а таксама, хаваючы сляды злачынства, учынілі падпал кватэры.

БЕЛТА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

БАНКІР ЗНІК З ГРАШАМІ

Супрацоўнікі міліцыі расшукваюць 37-гадовага Сяргея Астапенку, які, працуючы на пасадзе загадчыка сектара банкаўскага абслугоўвання юрыдычных асобаў аддзела аперацыйнага абслугоўвання Магілёўскага рэгіянальнага аддзялення ААТ «Белзнешэканомбанк», у красавіку незаконна, без плацежнай інструкцыі кліента, пералічыў з разліковага рахунка ААТ «Магілёўскі завод штучнага валакна» на рахунак ТАА «Тэрмаіндустрыя» 1 181 900 000 рублёў.

Як адзначаюць ва упраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, пасля банкір з гэтых грошай 191 мільён 900 тысяч рублёў пералічыў на разліковы рахунак мясцовага індывідуальнага прадпрымальніка, а астатнюю суму — 990 мільёнаў рублёў — на свой бягучы рахунак. Знік жа зламыснік толькі пасля таго, як выкрадзеныя грошы перавёў у наяўныя ў касах банкаў і банкаматах Магілёва.

КРЭДЫТНЫ «КАНВЕЕР»

Двое раней судзімых жыхароў Гродзенскай вобласці па махлярскай схеме атаварваліся ў сталічных магазінах дарагой тэхнікай.

Паводле звестак прэс-афіцэра Савецкага РУУС Вольгі Яскевіч, устаноўлена дачыненне падазроных да 12 фактаў махлярстваў з атрыманнем бытавой і камп'ютарнай тэхнікі ў крэдыт, аднак, паводле меркавання праваахоўнікаў, іх можа быць не менш за 30. Між іншым, «зарабляючы» грошы падманам прайдзісветы «Амерыку не адкрылі»: яны ўцягнулі ў «бізнэс» сваіх сяброў, знаёмых, сваякоў, якіх прывозілі ў краму і афармлялі на іх крэдыты на дарагую тэхніку, а пасля рэалізоўвалі апошнюю праз скупшчыка. Людзі, на якіх такім чынам афармляўся крэдыт, мелі свой інтарэс — атрымлівалі за паслугі адзін мільён рублёў. Самае цікавае, як адзначаюць у Савецкім РУУС, супрацоўнікі крымінальнага вышуку якога і затрымалі махляроў, што работнікі крамаў пры афармленні тавараў у крэдыт запісвалі ўсе звесткі пра крэдытаатрымальнікаў толькі з іх слоў. А вось месца працы гэтых кліентаў і нават кантактныя тэлефоны не правяраліся. Адметна і тое, што большасць асобаў, якіх прывозіў у краму «дуэт» хітруноў, былі нецвярозымі альбо пад наркатычным кайфам. Такім чынам, людзі, якія фактычна нідзе не працавалі, былі раней неаднаразова судзімыя і знешне выглядалі, мякка кажучы, не вельмі прыстойна, атрымлівалі ў крэдыт тэхніку коштам у некалькі мільёнаў. Дарэчы, агульная сума ўрону ў выніку згаданых махлярстваў ужо складае 35 мільёнаў рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

ШТО СЁЛЕТА КРАДУЦЬ АЎТАЗЛАДЗЕІ

Найбольш папулярныя — крадзяжы люстраных элементаў, сістэмы «парктронік»...

Як высвятляецца, больш за ўсё ад рук разукамплектоўшчыкаў церпяць гаспадары дарагіх аўтамабіляў. Прынамсі, на тэрыторыі Ленінскага раёна сталіцы (аднак, мяркуем, у іншых месцах тэндэнцыі падобныя). Дык вось, паводле звестак прэс-афіцэра Ленінскага РУУС Сяргея Козела, з такіх машын аўтазладзеі здымаюць люстэркавыя элементы, сістэмы «парктронік», молдзінгі, колы. Як вядома, камплектуючыя да дарагіх аўто каштуюць таксама вялікіх грошай. Напрыклад, толькі адзін люстэркавы элемент ад аўтамабіля БМВ у залежнасці ад мадэлі можа каштаваць мільён рублёў, сістэма «парктронік» — мінімум 600 тысяч, камплект колаў — ад 3 мільёнаў рублёў. Зрэшты, апошнім часам зламыснікі не грэбуюць і люстэркавымі элементамі скутараў, пачалі таксама красці амывальнікі фараў — з улікам рамонту такая прапажа абыходзіцца пацярпеламу да 2 мільёнаў рублёў. Акрамя таго, сталі набываць папулярнасць у зладзеяў арыгінальныя дэкаратыўныя каўпакі: такіх заяў у дзяжурную частку раённага ўпраўлення кожныя суткі паступае больш за пяць, а кошт камплекту ў сярэднім складае ад 300 тысяч рублёў. Крадуць таксама заглушкі ад літых дыскаў, а ўрон у гэтым выпадку складае ад 300 тысяч рублёў да аднаго мільёна. Зразумела, «цікавяцца» аўтазладзеі і аўдыё- і відэаапаратурай з салонаў аўто...

Ігар ГРЫШЫН.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЗПИ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом здания складского корпуса, об. пл. 3565,0 кв.м; здания контрольно-пропускного пункта, об. пл. 18,0 кв.м, расположенных по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Даумана, д. 97.

Начальная цена с НДС (снижена) – 2 164 303 489 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,5973 га. Задаток – 50 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.03.2010. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **25.05.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.05.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

Белагропромбанк
традиции. будущее

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 21 МАЯ 2010 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об утверждении дополнений и изменений в Устав ОАО «Белагропромбанк».
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 13 мая 2010 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 19 мая 2010 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» с 31 мая 2010 года.

Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 52 06.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, MTC) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.05.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲1 долар ЗША	2 990,00	1 чэшская крона	147,35
▼1 еўра	3 747,07	1 польскі злоты	939,97
1 латвійскі лат	5 285,02	▼1 расійскі рубель	99,48
1 літоўскі літ	1 083,47	1 украінская грыўня	377,76

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,0575
10 UAH	37,9442
1000 BYR	10,0628
EUR	37,7282

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ПРЭЗІДЭНТЫ КРАІН АДКБ ПАДТРЫМАЛІ РАШЭННЕ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ АКАЗАЦЬ САДЗЕЙНІЧАННЕ КУРМАНБЕКУ БАКІЕВУ

Прэзідэнты краін АДКБ на нефармальным саміце падтрымалі рашэнне прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі аказаць садзейнічанне Курманбеку Бакіеву і яго сям'і. Аб гэтым паведаміў генеральны сакратар АДКБ Мікалай Бардзюжа на прэс-канферэнцыі ў Маскве, прысвечанай вынікам праведзенага 8 мая нефармальнага саміту Савета калектыўнай бяспекі арганізацыі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Прэзідэнты краін АДКБ на нефармальным саміце падтрымалі прэзідэнта Беларусі, які, як яны сказалі, зрабіў па-мужчынску і высакародна, аказаўшы садзейнічанне Курманбеку Бакіеву і яго сям'і», — сказаў Мікалай Бардзюжа. Разам з тым, лічыць Мікалай Бардзюжа, Беларусь не займае асаблівай пазіцыі ў АДКБ у адносінах да Кыргызстана. «Аляксандр Лукашэнка сказаў адносна падзей у Кыргызстане тое, што сказалі і іншыя лідары АДКБ, а менавіта, што ў Кыргызстане адбылася неканстытуцыйная і нелегітымная змена ўлады. Асаблівасць пазіцыі заключаецца толькі ў тым, што беларускі прэзідэнт запрасіў да сябе прэзідэнта Кыргызстана Курманбека Бакіева», — адзначыў Мікалай Бардзюжа. «Гэта суверэнная справа Беларусі», — дадаў ён.

ВОДПУСК «НА РОДЫ» МОЖА СТАЦЬ БОЛЬШЫМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

@ На якую дадатковую падтрымку можа разлічваць сям'я, якая апынулася ў складаным матэрыяльным становішчы?

— Апроч дзіцячых дапамог і бясплатнага харчавання на дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, не трэба забываць пра адрасную сацыяльную дапамогу. Так, штомесячная адрасная дапамога можа аказвацца ў выпадку, калі сярэднедушавы даход кожнага члена сям'і за 12 месяцаў па аб'ектыўных прычынах не перавышае бюджэту пражыткоўага мінімуму — 266 230 рублёў. Умовы для аднаразовай дапамогі дзве: наяўнасць па-сапраўднаму цяжкай сітуацыі і даход ніжэй за 150 працэнтаў БПМ — менш чым 399 345 рублёў. Плюс да таго інвалідам III групы і дзецям ва ўзросце да 18 гадоў, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але маюць патрэбу ў тэхнічных сродках рэабілітацыі па заключэнні медыкаў, прызначаецца дапамога на аплату гэтых сродкаў. Прычым у апошнім выпадку ўзровень даходаў значэння не мае.

Зрэшты, па больш падрабязную інфармацыю аб правілах атрымання адраснай дапамогі можна звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароны свайго раёна.

@ На набыццё якіх канкрэтна сродкаў рэабілітацыі для дзяцей можа выдавацца адрасная дапамога?

— Дзецям ва ўзросце да 18 гадоў, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але маюць патрэбу ў тэхнічных сродках рэабілітацыі па заключэнні медыкаў, прызначаецца адрасная дапамога на набыццё артэзаў верхніх і ніжніх канечнасцяў (апараты, тутары), артэзаў тулава (гарсэты, бандажы, спінагаловатрымальнікі, жорсткія паясы), вырабаў лячэбнага пратэзавання (абдукцыйныя трусікі, распоркі), артапедычнага абутку, слыхавых апаратаў, тэст-палосак для вызначэння цукру ў крыві.

@ Ва ўзросце 5 гадоў дзіцяці вызначана інваліднасць. На якія ў сувязі з гэтым выплаты мае права наша сям'я?

— Сем'я, якая выхоўвае дзіця-інваліда, мае права на наступныя выплаты. Па-першае, на сацыяльную пенсію на дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, якая прызначаецца і выплачваецца штомесяц у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароны па месцы жыхарства. Памеры пенсіі залежаць ад ступені страты здароўя дзіцем і складаюць: пры першай ступені — 60, другой ступені — 65, трэцяй ступені — 75, чацвёртай ступені — 85 працэнтаў бюджэту пражыткоўага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. Цяпер гэтыя памеры вызначаны прыкладна ў 159, 173, 199 і 226 тысяч рублёў адпаведна.

Па-другое, варта сказаць пра дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Яна прызначаецца і выплачваецца штомесяц у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароны па месцы жыхарства маці, бацьку, апекуну ці іншай асобе, якая фактычна здзяйсняе догляд, не працуе і не атрымлівае пенсіі. Права на такую дапамогу таксама маюць маці ці бацька, што знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

Нарэшце, не трэба забывацца на дапамогу на дзіця-інваліда. Яна прызначаецца па месцы працы ці навучання маці, а калі маці не працуе і не вучыцца — па месцы працы бацькі незалежна ад ступені страты здароўя і атрымання іншых сацыяльных выплат (тых жа пенсіі па інваліднасці, дапамогі на догляд дзіцяці-інваліда). У прыватнасці, з 1 мая памер такой дапамогі на дзіця-інваліда ва ўзросце больш чым 3 гады з надбаўкай складае 111 820 рублёў.

@ Дзіцяці-інваліду споўнілася 17 гадоў, цяпер ён не вучыцца, а працуе. Ці робіцца з такім выпадку выплата дапамогі на дзіця-інваліда?

— Паводле заканадаўства, у выпадку, калі дзіця-інвалід працуе, то дапамога на яго не прызначаецца.

@ Якія ёсць ільготы пры будаўніцтве жылля ў маладых сем'яў з дзецьмі?

— Маладым сем'ям пры будаўніцтве жылля аказваецца фінансавая падтрымка для пагашэння запазычанасці па няльготных крэдытах: пры нараджэнні або наяўнасці першага дзіцяці — у памеры 20 бюджэтаў пражыткоўага мінімуму, пры нараджэнні або наяўнасці двух дзяцей — у 40, а пры нараджэнні або пры наяўнасці траіх дзяцей — у 50 БПМ. Існуюць і іншыя віды падтрымкі. Але імі лепш пацікавіцца ў выканкаме па месцы жыхарства ці ў «Беларусбанку».

@ Ці могуць прыцягваць да звышурочных работ бацькоў, якія маюць няпоўнагадовых дзяцей?

— Паводле артыкула 263 Працоўнага кодэкса, жанчына, якая мае дзяцей ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў, можа прыцягвацца да звышурочных толькі з яе асабістай згоды. Такое ж правіла датычыцца і працуючага бацькі, які выхоўвае дзіця ва ўзросце да 14 гадоў адзін, — без маці.

@ Апошнім часам зноў загучала тэма «падатку на халасцякоў». Ці з'явіцца ён у Беларусі?

— Такія прапановы ёсць, прычым самі па сабе яны не з'яўляюцца нейкай навацыяй. Варта нагадаць, што падатак на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных мужчын ва ўзросце ад 20 да 50 гадоў, а таксама на жанчын, якія знаходзіліся ў шлюбе, ва ўзросце ад 20 да 45 гадоў існаваў пры Савецкім Саюзе. У той час падатак не датычыўся толькі адзінокіх жанчын.

Пры распрацоўцы Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі гучалі прапановы вярнуцца да гэтай практыкі для стымулявання нараджальнасці. Аднак ад такіх прапаноў было вырашана адмовіцца. На наш погляд, нараджэнне дзяцей з'яўляецца вельмі далікатнай справай, кожны чалавек павінен падыходзіць да яе індывідуальна, без якога-небудзь ціску. Дзяржава павінна заахвочваць нараджальнасць праз дадатковыя прэферэнцыі, аднак не ўвядзенням мераў абмежавальнага ці прымусовага характару. Апроч таго, не трэба скідваць з рахунку адзін факт: 15-16 працэнтаў сем'яў пакутуюць ад бясплоддзя, яны хочуць, але не могуць мець дзяцей.

Таму ў вырашэнні праблем нараджальнасці лепш выкарыстоўваць шлях прамога матэрыяльнага стымулявання: павялічваць дапамогі, развіваць ільготнае крэдытаванне для маладых сем'яў — над гэтым, уласна кажучы, і працуе ўрад.

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ... Доктар адкажа

На будучым тыдні дзяжурыць на «гарачай лініі» Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

17 мая — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Вольга Барысаўна САЛКО.

18 мая — начальнік аддзела медыцынскай дапамогі дзецям і маці Міністэрства аховы здароўя Алена Леанідаўна БОГДАН.

19 мая — галоўны ўрач Рэспубліканскай дзіцячай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Галіна Мікалаеўна РАДЫЁНАВА.

20 мая — загадчыца лабараторыі экспертызы і рэабілітацыі НДІ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Алена Валер'еўна УЛАСАВА-РАЗАНСКАЯ.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

17 мая — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра Тамара Паўлаўна МАЦЮКЕВІЧ.

18 мая — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Ганна Ігараўна КОТАВА.

19 мая — загадчык аддзялення ультрагукавой дыягностыкі Мінскай абласной клінічнай бальніцы Васіль Мікалаевіч ПІСАРЭНКА.

20 мая — загадчык арганізацыйна-метадычнага кансультацыйнага аддзела Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Канстанцін Міхайлавіч МІНКЕВІЧ.

У графіку магчымыя змяненні.

ЭДУАРД МАЛАФЕЕЎ падаў у адстаўку

Пасля гучнай адстаўкі Сяргея Гурэнкі з пасады галоўнага трэнера мінскага «Дынама» такая ж навіна прыйшла са стану салігорскага «Шахцёра». 67-гадовы Эдуард Малафееў прыняў аналагічнае рашэнне, якое падтрымала кіраўніцтва клуба і падзякавала настаўніку за працу. Як паведамляе прэс-служба «Шахцёра», кіраваць камандай у наступным матчы, дзе салігорцы згуляюць з БАТЭ, будзе 38-гадовы Уладзімір Журавель. Эдуард Малафееў узначаліў салігорскую дружыну ў лістападзе 2009 года. Перад камандай была пастаўлена задача трапіць сёлета ў тройку прызёраў, а ў наступным сезоне змагацца за чэмпіёнскае званне. І Эдуард Васільевіч меў намер увасобіць гэтыя амбіцыйныя планы...

Алена КРАВЕЦ.

Абзац

◢ Стаўка ўвазной мытнай пошліны на плаўленыя сыры з 1 чэрвеня 2010 года будзе павышана да 15 працэнтаў, але не менш за 0,5 еўра за 1 кг. Такія новыя стаўкі Адзінага мытнага тарыфу Мытнага саюза на плаўленыя сыры.

◢ **Часова непрацуючы (неаднаразова раней судзімы за аналагічныя злачынствы) 28-гадовы магіляўчанін, заводзячы знаёмствы ў кавярні, на вуліцы, у гасцях у сяброў, прапаноўваў свае «паслугі» па спрыяльным вырашэнні пытанняў ва УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама. Кошт «паслугі» вагаўся ад 150 да 300 долараў. Пры гэтым ніякіх знаёмстваў са службовымі асобамі УДАІ ў махляра не было. Усяго прадпрымальны магіляўчанін завалодаў грашовымі сродкамі ў суме 7,7 млн рублёў.**

◢ Былы дырэктар лідскага РУП «Доследны завод Нёман», які абвінавачваецца у прычыненні страты прадпрыемству ў асабліва буйным памеры (Br39,5 млн), асуджаны на пяць гадоў. Ён з асабістай зацікаўленасці, дзейнічаючы насуперак інтарэсам службы, бязвыплатна перадаў у карыстанне прыватнаму прадпрыемству вытворчыя памяшканні плошчай каля 380 кв.м, а таксама 42 адзінкі абсталявання коштам Br88 млн. Здзелка не была аформлена дакументальна. На перададзеных вытворчых плошчах камерцыйная структура, якой кіраваў сын дырэктара, планавала ажыццяўляць рамонт і тэхабслугоўванне аўтамабіляў. Па ўказаннях дырэктара ва ўліковыя дакументы ўносіліся лжывыя звесткі пра аб'ёмы выкананай прадукцыі.

◢ **Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Расіі Уладзімір Чураў усталяваў у сваім кабінеце комплексную абарону ад праслухоўвання, якая абышлася ў 18 мільёнаў расійскіх рублёў.**

Поўны абзац

◢ Рэстараны McDonald's у Швецыі абвінавацілі ў пераштампоўцы датаў на старых прадуктах, якія павінны былі адправіцца на памыйніцу. Пасля таго, як дата на ўпакоўцы змянялася, салату прадавалі кліентам пад выглядам свежага прадукту.

◢ **Жыхар Швецыі ўстанавіў новы рэкорд па вертыкальным бегу (бегу па сценах). Аматар экстрэмальнага спорту пераадолеў стаметровы ўчастак сцяны за 34,76 секунды. Па правілах вертыкальнага бегу, спартсмен у альпінісцкай абвязцы спускаецца бягом па адвеснай сцяне тварам уніз.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Вниманию владельцев акций ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»

ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» сообщает, что 24 мая 2010 г. состоится внеочередное Общее Собрание акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» в заочной форме путем письменного опроса с повесткой дня:

- об утверждении договора о присоединении ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» к ОАО «Технобанк»;
- об утверждении передаточного акта прав и обязанностей ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» к ОАО «Технобанк»;
- о спонсорской и благотворительной деятельности.

Бюллетени для заочного голосования лица, имеющие право на участие в Общем Собрании акционеров ОАО «Белорусский Индустриальный Банк», могут получить, заполнить и предоставить по месту нахождения головного офиса ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» и его филиалов:

г. Минск, ул. Мельникайте, 8;
г. Витебск, ул. Чапаева, 16;
г. Гомель, ул. Головацкого, 19;
г. Гродно, бульвар Ленинского комсомола, 7а;
г. Могилев, пер. 2-й Крутой, 3а.

Срок окончания приема заполненных бюллетеней – 21 мая 2010 г.

Информация по вопросам повестки дня предоставляется по указанным адресам лицам, имеющим право на участие в собрании, при предъявлении ими документов, подтверждающих личность и полномочия представителя.

Телефон для справок: (8 017) 209 42 05.

Наблюдательный Совет ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

Вниманию владельцев акций ОАО «Технобанк» и ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»!

Сообщаем, что 24 мая 2010 г. по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 в связи с реорганизацией ОАО «Технобанк» и ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» в форме присоединения ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» к ОАО «Технобанк» состоится совместное Общее Собрание акционеров ОАО «Технобанк» и ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» в очной форме с повесткой дня:

- об увеличении уставного фонда ОАО «Технобанк».
- о внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Технобанк».

Время начала собрания – 14.00.

Начало регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании, – 13.30 при предъявлении документов, подтверждающих личность и полномочия представителя.

Информацию по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в собрании, могут получить при предъявлении документов, подтверждающих личность и полномочия представителя, по месту нахождения головных офисов ОАО «Технобанк», ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» и филиалов ОАО «Белорусский Индустриальный Банк» в их рабочее время по следующим адресам:

г. Минск, ул. Кропоткина,44;
г. Минск, ул. Мельникайте, 8;
г. Витебск, ул. Чапаева, 16;
г. Гомель, ул. Головацкого, 19;
г. Гродно, бульвар Ленинского комсомола, 7а;
г. Могилев, пер. 2-й Крутой, 3а.

Наблюдательный Совет ОАО «Технобанк»

Наблюдательный Совет ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, И НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится 23 июня 2010 г. в 11.45 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222)229022, 311185, 223375.

Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. 8(0225)43 40 20; по лоту № 2 – концерн «Белнефтехим», тел. 8(0222)22 21 98, 39 18 26.

Заявления на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами 21 июня 2010 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона 23 июня 2010 г. с 10.00 до 10.50.

№ лота	Сведения о предметах аукциона							
	Информация о недвижимом имуществе			Информация о земельных участках			Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	Сумма задатка, тыс. руб.
	Наименование и краткая характеристика	Балансодержатель объекта и место нахождения продаваемого имущества	Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб.	Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена права заключения договора аренды земельных участков, тыс. руб.		
1	**Капитальные строения**: клуб-столовая двухэтажное кирпичное здание 2331 кв.м; два спальных корпуса двухэтажные кирпичные 1255 и 1254 кв.м; павильон летний душевой двухэтажный кирпичный 73,1 кв.м; павильон встреч с террасой одноэтажный кирпичный 85 кв.м; дом для персонала с террасой двухэтажный кирпичный 124,3 кв.м; асфальтобетонное покрытие 5665 кв.м; туалет кирпичный 17 кв.м; подземная емкость пожаротушения бетонная 34 куб.м, обвалована землей	ОАО «Бобруйск–агромаш»; Могилевская обл., Глусский район, в районе дер. Городок	1 629 801,885	10,8783	60	1 001,038	1 630 802,923	50 000,0
2	Здания и сооружения базы отдыха «Надежда»	ОАО «Могилевский «ЗИВ»; Могилевская область, Могилевский район, район дер. Межисетки	794 113 628	5,2617 и 0,3600	50	1 167,600	795 281,228	50 000,0
	Краткая характеристика имущества, входящего в состав лота № 2: Капитальные строения: склад инвентаря № 3 одноэтажный кирпичный, 338,2 кв.м; здание насосной станции над артезианской скважиной № 1 одноэтажное, кирпичное, 8,2 кв.м; здание для игр, одноэтажное, 219,6 кв.м, стены - шиферное ограждение, здание спального корпуса, одноэтажное, бревенчатое 142,6 кв.м; здание водолечебницы, одноэтажное, кирпичное 650,1 кв.м; здание столовой, одноэтажное, кирпичное 456,1 кв.м с дорогой с асфальтобетонным покрытием и площадкой 1392,7 кв.м; здание клуба, одноэтажное, кирпичное, 198,9 кв.м с покрытием из плит, 422 кв.м; здание трансформаторной подстанции № 1, 14,4 кв.м; здание хлораторной, одноэтажное, кирпичное, 14,6 кв.м; здание насосной станции № 2 одноэтажное, кирпичное, 11,1 кв.м; склад инвентаря № 2, 113 кв.м; здание овощехранилища, одноэтажное, кирпичное, 78,9 кв.м; здание склада № 1, одноэтажное, кирпичное, 100,2 кв.м с дорогой с асфальтобетонным покрытием, 200 кв.м; здание котельной, одноэтажное, кирпичное, 214,8 кв.м с площадкой с асфальтобетонным покрытием, 427 кв.м; здание спального корпуса № 2, двухэтажное, кирпичное, 796,9 кв.м; здание спального корпуса № 1, двухэтажное, кирпичное, 794,3 кв.м с дорожками, 566 кв.м и 438 кв.м; здание административно-лечебного корпуса, одноэтажное, кирпичное, 423,2 кв.м с дорожками, общей площадью 536,2 кв.м; дом № 2 финского типа одноэтажный, сборно-щитовой, 60,9 кв.м; дом № 1 финского типа, одноэтажный, сборно-щитовой 61,2 кв.м; здание трансформаторной подстанции № 2, 24,7 кв.м; мост пешеходный через р. Лахва; артезианская скважина № 1 глубиной 50 м; башня водонапорная, металлическая, 21 куб.м; забор деревянный, 253 м; ограждение артезианских скважин – металлическая сетка, 152,5 м; артезианская скважина № 2 глубиной 77 м; электрическая сеть, 2403,8 м; водопроводная сеть, 753,6 м; канализационная сеть, 734,8 м, тепловая сеть, 665,8 м.							

Начальная цена недвижимого имущества, входящего в состав лотов, понижена: по лоту № 1 – на 20 процентов, по лоту № 2 – на 50 процентов.

Условия для победителей аукциона в отношении земельных участков, право заключения договора аренды которых входит в состав:

лота № 1:

- в случае изменения целевого назначения объектов недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Глусского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет;
- приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев со дня получения документов, удостоверяющих государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения права на него, а в случае изменения целевого назначения объектов недвижимого имущества – в течение шести месяцев со дня разработки и утверждения строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта;
- при перепрофилировании объекта по функциональному назначению получить в установленном порядке согласование Глусского РОЧС;

лота № 2:

- приступить к занятию земельных участков в течение шести месяцев со дня получения документов, удостоверяющих государственную регистрацию создания земельных участков и возникновения прав на них;
- в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Могилевского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет.

Земельные участки, право заключения договора аренды которых входит в состав лота № 2, расположены в водоохранной зоне реки Лахва, в которой устанавливается специальный режим хозяйственной деятельности, которая должна осуществляться с соблюдением мероприятий, предотвращающих загрязнение, засорение и истощение вод. С перечнем ограничений в использовании указанных земельных участков можно ознакомиться у организатора аукциона.

Задатки перечисляются на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

7	**Целевое назначение**	для строительства и обслуживания кафе	для строительства и обслуживания магазина промышленных товаров со складом	для размещения торгового павильона для торговли автозапчастями	для строительства и обслуживания торгового павильона
8	**Срок аренды**	30 (тридцать) лет	30 (тридцать) лет	10 (десять) лет	10 (десять) лет
9	**Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия**	Участок свободен от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ)			
10	**Ограничения и условия**	1. Внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка. 2. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания и изменения земельного участка. 3. Заключение победителем с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год. 5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.			
11	**Охранная зона, га**	0,0019	–	–	0,0041
12	**Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории**	Подключение к общегородским сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД.			
13	**Начальная стоимость, рублей**	3 744 077	651 766	354 796	2 407
14	**Сумма задатка, рублей**	350 000	60 000	30 000	200
15	**Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей**	1 682 341	1 746 689	1 444 076	1 635 830
16	**Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей**	1 000 000	1 000 000	1 000 000	1 000 000

1. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В течение 10 рабочих дней местный исполнительный комитет принимает решение о предоставлении земельного участка в аренду. Победитель обязан внести плату за право аренды земельного участка, определенную в результате торгов, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 № 462.

2. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) не позднее 11 июня 2010 года подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, предоставляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

3. Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530026 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354.

4. Оплата стоимости предмета аукциона, расчеты с организатором аукциона осуществляются в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. **Контактные телефоны: 8 (02334) 9 11 21, 2 18 18.**

Наш культурны асяродак
Жыранделя
Выпуск № 7 (93)

БЕЗДЗЕЖСКІЯ СКАРБЫ

Яшчэ нідзе ў Беларусі большай пашаны, чым у вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна, жаночаму ткана-вышыванаму фартушку і наогул мясцоваму традыцыйнаму касцюму не надавалася. Тут для яго стварылі нават музей! Некалі гаспадыні, выхваляючыся адна перад адной, узвялі культ фартушка да неверагодных вышынь. Вышытыя працавітымі рукамі бездзежскіх сялянак кветкі на фартушках увабралі ў сябе сапраўднае харство шчырых жаночых пачуццяў. Спецыялісты этнакультуры ставяць жаночае ўбранне вёскі Бездзеж на ўзровень мастацкага твора, адзначаюць у спалучэннях колераў самую дасканальную гармонію. Шкада, што ў наш час няма моды на нацыянальнае адзенне, як напрыклад, у баварцаў ці партугальцаў (тое, што бачыў на ўласныя вочы), дзе вопратка выкарыстоўваецца ў штодзённым ужытку. Толькі па вялікіх рэлігійных святах бабулі і прабабулі дастаюць з шафаў і куфраў свае колішнія скарбы, і тады вёска Бездзеж становіцца зноў непадобнай ні на якія іншыя.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

ПІЯНІСТ

Беларус Віталь СТАХІЕВІЧ іграе героя знакамітага фільма Рамана Паланскага

Формула ўдачы

ПРАЎДА, у тэатральным праекце, які ажыццявілі і паказваюць у Галандыі. Аднак гісторыя — дакладна тая ж: Уладзіслава Шпільмана, які выжыў у варшаўскім гета. Толькі гэты праект — тэатр аднаго акцёра, з удзелам піяніста, які па-сутнасці іграе сольны канцэрт. Вось гэты канцэрт — з нязвыклымі для музыканта тэатральнымі спецэфектамі ў выглядзе папяровага снегу ды без аніякіх перапынкаў — іграе Віталь. Гэта роля стала ягонай — таму што ён выдатны піяніст, не аднойчы станавіўся лаўрэатам міжнародных конкурсаў. І таму што цяпер там жыве...

Аднак яго асабістая гісторыя сведчыць пра тое, што немагчыма адарвацца ад сваіх каранёў, нават калі лёс падараваў магчымасць выступаць у прэстыжных залах Еўропы. Стахіевіч з ахвотай выступае на радзіме. Ужо 20 мая ён будзе іграць у Сафійскім саборы Полацка, на наступны дзень — у Гродне, у Новым замку. А 27 мая яго канцэрт адбудзецца ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі, дзе будзе размаўляць са сваімі землякамі на мове музыкі. Напэўна, гэта самая блізкая яму мова, якую разумеюць ва ўсіх краінах свету. Але сайт Стахіевіча існуе на беларускай, галандскай і англійскай мовах. Сярод іх ёсць родная — і гэтае паняцце нязменнае для яго. Беларуская ў ягоным штодзённым жыцці выліваецца ў дзённікавых запісах у блогу, у якіх адчуваецца чаканне сустрэч на радзіме... Як і ў яго адказах на мае пытанні.

Фота Анускі ІЛСІНКІ.

— Вы родам з краіны васількоў, але жывяце ў краіне цюльпанаў. Што вам дала адна і чым прывабіла другая?

— Родная краіна дала пэўную сістэму вартасцяў, выдатную школу і ўвогуле тое, што можна назваць персанальнасцю. Нейкі асабісты досвед з самага маленства і да перыяду ўваходу ў самастойнае жыццё, які накладае адбітак на ўсё, што робіш і адчуваеш, і які ўласцівы менавіта табе. У Галандыі ж я ўпершыню апынуўся сапраўды адзін, навучыўся прымаць нейкія рашэнні і ўвогуле — думаць за сябе. Гэта цалкам магло б быць і нейкае зусім іншае месца, аднак Нідэрланды аказаліся вельмі вартым краем. У ім уражвае інтэнсіўнасць культурнага жыцця і адкрытасць чалавечых адносінаў.

— У Галандыі вы адчуваеце сябе грамадзянінам Еўропы ці ўсё-такі памятаеце пра тое, што вы беларус?

— Я не стаў бы так моцна размяжоўваць паняцці «Еўропа» і «Беларусь», мне здаецца, што адначасова ўспрымаю сябе беларусам і еўрапейцам. Быць беларусам, на маю думку, азначае папросту быць самім сабой, менавіта такім, якім цябе зрабіла жыццё і тваё асяроддзе.

— Ваша злучэнне з музыкай адбылося ў Беларусі — дзякуючы каму? Ці старанным вы былі вучнем?

— Так, я быў старанным вучнем. А на гульні, тым не менш, хапала часу. Лічу, што мне надзвычай пашанцавала ў жыцці з настаўнікамі. З асаблівай цеплынёю і бязмежнай удзячнасцю заўсёды думаю і пра свайго першага педагога фартэпіяна Алену Алегаўну Украінскую, і пра майго ліцэйскага і кансерваторскага настаўніка Зою Веніямінаўну Качарскую. Мы падтрымліваем цесны кантакт, і нашы стасункі даўно перайшлі на нейкі вельмі блізкі, амаль сямейны ўзровень. Ганаруся, што быў вучнем Рэспубліканскага музычнага каледжа, цудоўнага месца на зямлі. З настальгіяй згадваю нашых выдатных настаўнікаў самых розных дысцыплін, творчую атмасферу школьных гадоў.

— Ці не было іншай мары? Калі зразумелі, што ваша будучыня — у вашых руках?

— Усведамленне гэтага надыходзіць дзесьці на сярэдніх курсах кансерваторыі, калі студэнт упершыню сапраўды пачынае ўзірацца ў абсягі незалежнага існавання. Гэта можа быць пэўным крызісам на нейкім этапе, а можа і падштурхнуць да новых здзяйсненняў. Іншыя мае мары, кшталту жадання быць футбалістам або, наадварот, рэдактарам культурніцкай газеты, заўсёды, бадай, заставаліся менавіта марамі, якія мелі мала сувязі з рэчаіснасцю...

— Калі і як з'явілася магчымасць з'ехаць? Што гэтаму спрыяла і ці лёгка было прыняць рашэнне?

— Паехаў у Амстэрдам, каб атрымаць дыплом магістра. Гэта адзін з дарэчных і вельмі распаўсюджаных момантаў у жыцці, каб пазнаёміцца з традыцыямі іншай краіны і атрымаць новы штуршок у прафесійным развіцці. Упэўнены, што такі досвед вельмі карысны амаль для кожнага, таму гэта рашэнне прымалася даволі лёгка. Мне пашанцавала павучыцца ў класах выдатных канцэртных піяністаў Хокана Аўстбё і Навума Груберта. Вельмі многа дала магчымасць рэгулярна слухаць музыкантаў сусветнага ўзроўню. Спярша, натуральна, у мяне не было ні знаёмстваў, ні якіх-небудзь выступленняў. Але з цягам часу пачалі з'яўляцца канцэрты, і з кожным годам іх колькасць расце. У Галандыі, пры ўсіх натуральных мясцовых асабістых інтарэсах, даволі высока разумеецца аб'ектыўнасць і роўнасць стаўлення да людзей. Таму амаль у кожнага, пры адпаведных намаганнях, з'яўляецца шанц заявіць пра сябе і знайсці зацікаўленую публіку.

— Для творчай асобы важнае асяроддзе, каб былі людзі, якія разумеюць і падтрымліваюць. Ці ёсць побач з вамі такія?

— Найлепш за ўсіх людзей на свеце мяне разумее мая жонка — Аксана. Мы абое піяністы і таму прафесійныя праблемы і прыхільнасці ў нас вельмі блізкія. Мы сустрэліся ў Мінску і вельмі хутка я зразумеў, нават востра адчуў, што гэты незвычайны цудоўны чалавек — мой родны. Падчас маіх важных выступленняў, упэўнены, Аксана перажывае больш, чым я сам, і тое ж самае адбываецца са мною, калі іграе яна. Натуральна, найбліжэйшае асяроддзе для мяне — гэта сям'я, мае бацькі і родныя, а таксама вузкае кола сапраўдных сяброў.

— Якім чынам удаецца за мяжой, у чужым моўным асяродку, захаваць беларускую мову? Ці дапамагаюць любімыя кніжкі?..

— Будзем гранічна шчырыя: найперш на мінскіх вуліцах востра стаіць пытанне пра захаванне беларускамоўнага асяродку. Аднак і ў замежных умовах быццё, знітаванае з роднай мовай, можа быць лёгкім, натуральным. Нас жа ніхто не прымушае думаць, марыць або пісаць свае вершы па-беларуску! Чытаю, як і большасць з нас, у асноўным па-руску. Аднак ёсць і любімыя айчынныя аўтары, галоўныя з якіх Быкаў, Чорны, Багдановіч.

— У якіх выпадках, магчыма, праяўляецца ваш беларускі характар? Ці дапамог ён вам у новых умовах?

— Калі шчыра, цяжка ўявіць, што такое тыповы беларускі характар, як і любы іншы. Індывідуальныя рысы таго ці іншага чалавека, па-мойму, значна мацнейшыя за нейкія клішэ, звязаныя з той ці іншай нацыяй. Я лёгка знаёмлюся і сыходжуся з людзьмі, напэўна гэта і дапамагае ў новых умовах.

— Ці ўплывае характар на музыку, якую вы іграеце ў канцэртах? Якія творы вам бліжэй, можа ёсць любімыя?

— Вядома, бо музыкант менавіта імкнецца праявіць ігрой, хай апасродкавана, сваю індывідуальнасць. Каму цікавае нейкае міфічнае ідэальнае, адзіна магчымае, выкананне таго ці іншага твора? Толькі прысутнасць асабістага прачытання робіць, як мне здаецца, канцэрт прыцягальным, незабыўным. Апошнім часам часта іграю творы Шапэна, Моцарта, Пракоф'ева, Рахманінава, Штрауса. Хоць сярод спадчыны многіх, многіх кампазітараў ёсць любімыя опусы.

— Ці ёсць магчымасць выконваць творы беларускіх кампазітараў? Ды ўвогуле якім чынам фарміруеце праграмы? Хто «заказвае музыку»?

— У большасці выпадкаў магчыма самастойна выбіраць творы для праграм. Толькі зрэдку атрымліваеш пажаданні канкрэтных твораў ці кампазітараў, і тады імкнешся іх задаволіць. Напрыклад, сёлета адзначаецца 200 гадоў ад нараджэння Фрыдэрыка Шапэна. Адбываецца безліч канцэртаў з шапэнаўскімі праграмамі, вельмі часта выконваюцца найбольш знакамітыя творы гэтага аўтара. Наўрад ці сам я вырашыў бы акурат цяпер брацца за шапэнаўскую Санату сі-бемоль мінор, шэдэўр кампазітара, які іграўся і іграецца надзвычай часта. Аднак была прапанова ўзяць удзел у тэатральным праекце «Піяніст» з канкрэтнай праграмай з твораў менавіта Шапэна, у тым ліку і са згаданай Санатай. Гэта сапраўдная гісторыя варшаўскага піяніста-яўрэя Уладзіслава Шпільмана, якому ўдалося выжыць у нечалавечых умовах гета і фашысцкай акупацыі, яна стала вядомаю дзякуючы аднайменнаму фільму Рамана Паланскага. Тады я ўжо не мог адмовіцца ад вывучэння новых для сябе твораў Шапэна і вырашыў ставіць некаторыя з іх таксама ва ўласныя праграмы.

Не стаўлю перад сабой нейкай асаблівай задачы, каб выконваць беларускую музыку, іграю яе тады, калі гэтага хочацца і калі гэта дарэчы. Напрыклад, у наступным сезоне маю задуму падрыхтаваць некалькі паланезаў Напалеона Орды, музыкі, якая цяпер нібы вяртаецца з забыцця.

— Хто дапамагае ў арганізацыі канцэртаў? Дзе яны адбываюцца? Колькі канцэртаў у месяц вы маеце?

— Неяк па-рознаму. Канцэрт можа быць і ў вядомай зале, і ў царкве, і ў доме састарэлых, і ў прыватнай сялібе. Часта даводзіцца займацца арганізацыйнымі пытаннямі самому. Аднак ёсць вельмі добры і шчыры сябар, без дапамогі якога многіх выступленняў папросту не было б. Так пашанцавала, што гэтай вясной надалася проста неверагодная колькасць канцэртаў. У сакавіку мы адыгралі вельмі адказны тур з вядомай беларускай скрыпачкай Ксеніяй Бельцюковай, нашы канцэрты адбываліся ў найпрэстыжнейшых залах Нідэрландаў. І адразу ж пасля гэтага тура распачаліся паездкі са спектаклямі, пра якія я толькі што распавядаў, з вельмі шчыльным графікам, часам тры ці чатыры дні запар. Аднак у цэлым рэгулярнасць канцэртаў вельмі розная, непрадказальная.

— Ці лёгка было прыстасоўвацца да замежнай сістэмы канцэртнага жыцця? Чым яна прынцыпова адрозніваецца ад беларускай?

— Вялікае адрозненне ў тым, што канцэрты нават у маленькіх гарадках ці вёсках, не кажучы ўжо пра прэстыжныя залы, зазвычай плануюцца загадзя, часта нават за год наперад. Гэта дапамагае арганізаваць свае заняткі і канкрэтней уяўляць каляндар. Ну і, вядома, добрыя раялі. Было б цудоўна, калі б у Беларусі нават у прыватных дамах і сельскіх клубах стаялі спрэс «Стэйнвэі» і «Ямахі»!..

— Ці можна параўнаць музычныя густы той публікі і беларускай? Дзе больш патрабавальны слухач?

— У нас сярод публікі вышэйшы працэнт людзей, якія займаюцца музыкай прафесійна. Там жа на канцэртах больш проста аматараў, проста зацікаўленых класічнай музыкай людзей. Вельмі шмат пажылых асобаў. Патрабавальнасць жа, хутчэй за ўсё, прыблізна аднолькавая.

— Як часта выступаеце з канцэртамі на радзіме? Што яны вам даюць?

— Іграю штогод і заўсёды імкнуся не абмяжоўвацца толькі Мінскам. Для мяне шчасце нават проста прайсціся роднымі вуліцамі, праехацца цягніком у нейкі іншы горад, мець стасункі з рознымі людзьмі. Заўсёды прыемна і, разам з тым, надзвычай адказна іграць менавіта перад роднай публікай.

У Беларусі жывуць практычна ўсе мае родныя і многія з сяброў. Аднак большасць аднакласнікаў знаходзіцца цяпер у розных краінах свету.

— Ці падтрымліваеце сувязі з беларускімі музыкантамі, якія таксама працуюць у іншых краінах?

— Так. Тут дапамагае яшчэ і тое, што большасць з нас паходзіць з адной музычнай акадэміі, а часта і з аднаго каледжа. Гэта значыць, што мы не толькі калегі-суайчыннікі, але яшчэ і проста аднакашнікі.

— Ці адчуваеце сябе рэалізаваным — у прафесійным і чалавечым плане?

— У некаторай ступені рэалізаваны, хаця выдатна ведаю, што павінен бясконца ўдасканальвацца. Як толькі чалавеку пачынае здавацца, што ён ужо чагосьці дасягнуў і гэтым можна ганарыцца — значыць ён на парозе сваёй мяжы, за якою заняпад. Спадзяюся, што мне гэта аніяк не пагражае.

— Чым вы абавязаныя музыцы ў сваім жыцці? Магчыма, ёсць у вас іншыя захапленні, калі ёсць на іх час?

— Адно з маіх гарачых захапленняў — падарожнічаць. Дзякуючы музыцы — канцэрты, конкурсы, фестывалі, майстар-класы — гэта ўдаецца рабіць даволі часта. Вялікі футбольны заўзятар. Люблю наведваць канцэрты, выставы, спектаклі. Люблю весці свой блог і асабліва чытаць стужку сяброў (маю на ўвазе «Жывы Журнал»). Цікава, калі дазваляе час, зазірнуць у «Facebook» або «В Контакте», пагаманіць праз «Skype». Захапляюся магчымасцямі «Вікіпедыі».

— Кажуць: «Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць...» Ці працуе гэтая фармулёўка? Што значыць для вас — любіць радзіму?

— Так, сапраўды, існаванне на пэўнай адлегласці дае магчымасць па-новаму ўбачыць уласную краіну, больш горача ацаніць яе станоўчыя бакі, лепей зразумець, чым выкліканы праблемы. Для мяне любіць родны край, як і любіць чалавека, значыць заўсёды думаць пра яго, клапаціцца пра яго і зычыць яму толькі дабра.

Падрыхтавала
Ларыса ЦІМОШЫК,

ЛЕС І ЧЫНОЎНІКІ

Раблю з вялікай працы маленькі дакладзік і раптам разумею, што большая частка часу ідзе на пераафармленне спасылак. Ну не разумею, навошта ў спасылцы пазначаць колькасць старонак у кнізе, з якой узятая цытата? Каб ураўнаваць калегаў таўшчынёй прачытанага? Яшчэ б штрых-код папрасілі...

Калі вучылася ў школе, усе сшыткі падпісваліся аднолькава. З першага да апошняга класа. А вось апошні час гляджу на сшыткі сучасных школьнікаў і ламаю галаву. Навошта ўвесь час мяняць правілы афармлення сшыткаў? І хто прыдумаў пісаць у адным радку па пяць слоў?

І школьнікі, і студэнты, і маладыя навукоўцы ў адзін голас скардзяцца на тое, што няма з афармленнем працаў ніякай пэўнасці. Асабліва цяжка, так выглядае, даводзіцца студэнтам, у якіх і курсавыя, і дыпломныя, і выступы на канферэнцыях... І штогод гэта ўсё трэба падпісваць па новых правілах.

Вось цікавы механізм такіх праектаў. Сядзіць чыноўнік, сядзіць у кабінеціку і раптам: «Эўрыка! Знайшоў! Трэба пісаць не «па беларускай мове», а «для работ па беларускай мове»!» І паляцелі паперы, паперы, паперы па ўсіх навучальных установах краіны...

Кожны чалавек, як вядома, павінен зрабіць тры рэчы. Пабудаваць дом, выгадаваць сына і пасадзіць дрэва. Дык вось, на мой погляд, чыноўнікі нашы адукацыйныя павінны за выццё пасадзіць як мінімум дзялянку.

НОС ПА ВЕТРЫ

Помню, як моцна мяне ўразіў выхад «Свяшчэннай кнігі пярэваратня» В. Пялевіна.

Было такое ўражанне, што мне ў галаву ўсунулі ёршык для мыцця бутэлек і пару разоў там правярнулі, пачысціўшы мозг. Здаецца, ні адзін з пялевінскіх твораў так моцна на мяне не падзейнічаў, як гэты. Асабліва ўразілі тыя старонкі, якія былі прысвечаны... нюху. Прынамсі, менавіта там я ўпершыню прачытала меркаванне, што пахі не змешваюцца, а абвалакваюць адзін у адно, укладаючыся, як ліст у канверт... Так ярка пра водары, здаецца, пісаў толькі Зюскінд у сваім культавым «Парфумеры».

Мне здаецца, чалавецтва ўсё больш арыентуецца на свой уласны нос... І гэта не дзіўна — верыць вачам нас ужо даўно адвучылі рэтушоры і кінематаграфісты, вушам — палітыкі і радыйшчыкі, болю — тэмп жыцця і анальгетыкі. І толькі ўласны нос нам не здраджвае, хоць ужо і вядзе налева.

Некалькі гадоў таму заўважыла, што ў вялізным сталічным супермаркеце ўвесь час выходжу на адно і тое ж месца — выспачку, дзе гандлююць разнастайнымі гатункамі кавы. Тады мне здалося забаўным, што мой нюх так маніпулюе маімі паводзінамі. Сёння я добра ведаю, што існуе цэлая галіна нейрамаркетынгу — водарамаркетынг, які прымушае нас, пакупнікоў, рабіць свой выбар. Кожны водар мае здольнасць выклікаць канкрэтныя эмоцыі, якія не падлягаюць нашай свядомасці... І гандляры гэтым бессаромна карыстаюцца, прадаючы нам не столькі прадукт, колькі ілюзію дабрабыту, раскошы, новага жыцця і новых магчымасцяў. Сучасны маркетолаг ведае, што ў краме з прадуктамі павінна пахнуць свежым гурком ці кавуном, а ў краме з адзеннем — ваніллю, лавандай альбо лімонам. Прызнаюся, я і сама актыўна карыстаюся сваімі ведамі, ствараючы ва ўласнай кватэры ілюзію цёплага ўтульнага дома з дапамогай араматызатара «cherry pie».

Дарэчы, пытанне «Даруйце, якім парфумам вы карыстаецеся?» у дачыненні да мяне самае ўжывальнае, прынамсі, значна абганяе ўсе, зададзеныя мне на вуліцы мужчынамі. Яго задаюць мне з такой частатой і рэгулярнасцю, што я стала падумваць — можа, яно ўваходзіць у праграму сучасных лавеласаў-пікапераў? Аднак нядаўні выпадак прымусіў мяне перакананца ў шчырасці апытальнікаў. Прынамсі аднаго.

...У метро я прысела на лаўку ад стомы — у руках былі валізы з прадуктамі, а апранулася я не па надвор'і цёпла. Немалады грузны мужчына, яўна правінцыял, які ўжо сядзеў побач, пакруціў галавой і без ценю няёмкасці спытаў:

— Скажыце, гэта французскія духі ў вас?

Прызвычаеная да гэтага пытання без какецтва адказваю. Назву і вытворцу. Ён узмахвае рукой, маўляў, няважна, і прадаўжае:

— Скажыце, а ў Францыі вы былі?

Трохі здзівіўшыся, адказваю, што так, была... І тут ён зазірае мне проста ў вочы і паварочвае размову ўжо зусім у нечаканы бок:

— Ну і як там людзі жывуць?

Я паціскаю плячыма, маўляў, нармальна... І тут ён пераходзіць да галоўнага:

— Вось думаю пераехаць... Як вы думаеце, варта перабрацца за мяжу?

Ад нечаканасці, ад яго шчырасці, ад яго аблічча — такога, разумееце, немаладога спрацаванага каня, абсалютна шчыра адказала, што думаю пра эміграцыю ў Францыю, хоць, прызнаюся, ніколі ў жыцці сама пра гэта не задумвалася... І тут ён спытаў:

— А ў Бельгіі вы былі?

І вось мне давялося расказваць пра ўсе краіны, дзе была. Падсвядома я разумела, што ён ужо зрабіў свой выбар і толькі хацеў яго пацвердзіць...

Мы прагаварылі не больш за дзесяць хвілін, але я доўга пасля абдумвала гэты выпадак. Які яму сэнс быў пытацца ў абсалютна незнаёмага чалавека пра такія жыццязначныя рэчы? — задавала я сабе пытанне, і сама ж на яго адказвала: «Ён даверыў свой лёс не мне, ён даверыў яго ўласнаму носу, які яго ніколі не падводзіў! Чаму ўласна ён павінен верыць не носу, а, напрыклад, журналістам?»

З той пары я часта думаю — а як пахне Беларусь? Іншым разам мне здаецца, што я з заплюшчанымі вачыма змагла б вызначыць пах многіх краін. Дакладна Украіны, Галандыі і Ізраіля. З вялікай доляй верагоднасці Балгарыю і Францыю. Наўрад ці Швецыю і Нямеччыну... Але вось сфармуляваць для сябе, як пахне мая радзіма, пакуль не магу. Найбольш асацыюецца ў мяне сённяшняя Беларусь з пахам новабудоўлі.

Ганна КІСЛІЦЫНА.

АФАРЫЗМЫ

Георгій МАРЧУК

❖ Калі ты патрэбны хоць аднаму чалавеку, можаш лічыць сябе шчаслівым.

❖ Шмат хто і харошы, і добры, калі гэта яму неабходна.

❖ Культура — гэта матэрыялізацыя духоўнасці праз мастацтва, літаратуру, этыку і эстэтыку.

❖ Старасць наступае тады, калі ты ўсё больш і больш знаходзіш знаёмых прозвішчаў на надмагільных помніках.

❖ Успомнім, што ёсць жыццё? Мітусня мітусні. Дык і гэта добра. Мітусня — тканіна, на якой чалавек жарсцямі, звычкамі, учынкамі, абавязкам вышывае малюнак свайго лёсу.

❖ Няма такога пісьменніка, які б не хацеў мець музей свайго імя. І лепш яшчэ пры жыцці.

❖ Чалавек моцнай волі?

Чалавек, які можа памерці, калі захоча, і які ніколі не памрэ сам, як бы да гэтага ні прымушалі абставіны.

❖ Нічога так не ўзнімае дух, як нечакана знойдзены на вуліцы рубель.

❖ Калі пісьменнік хоча зняважыць свайго калегу, ён дае яго прозвішча сваім героям, як правіла, адмоўным.

❖ Старасць не радасць, аднак усім хочацца дажыць.

❖ Даўгавечнасць кахання залежыць ад доўгацярплівасці жанчыны і ад ступені мужчынскай ляноты.

❖ Грэх пісаць у дзённіках адмоўна пра людзей, якія памерлі. Яны не могуць сябе абараніць.

❖ Дзённік пісьменніка — гэта не разважанні, не філасофствованне, не лірычныя запісы. Гэта заўсёды апраўданне ўласнай слабасці ў гэтым свеце.

❖ Калі ты выпіў з крывадушнікам на брудэршафт, ты таксама крывадушнік.

❖ Калі змовяцца несумленныя і зайздрослівыя людзі, дык можна на вельмі доўгія гады замоўчаць вялікі талент.

❖ Калі бачыш, што нічым значным не застаешся ў гісторыі, адшукай хоць бы аднаго вялікага, які нарадзіўся з табой у адзін дзень, і тым суцяшайся.

❖ Атэіст — гэта не той, хто не верыць у Бога, а той, хто намагаецца паставіць сябе на яго месца.

❖ Для аднаго чалавека набытак — шчасце, для іншага страта — шчасце. Усё залежыць ад таго, хто набывае і што страчвае.

Кніга — гэта смутак па ўсім тым, што пражыта і надзея на памяншэнне гэтага смутку ў будучыні.

Пытаеш, якая розніца паміж хітрым і разумным? Хітры на адзін раз. Разумны назаўсёды.

❖ Той, хто згубіў цікавасць да прафесіі, ідзе ў палітыку.

❖ Той, хто думае пра годны канец жыцця, жыве сумленна.

❖ На надмагільным помніку маці я напісаў: «Мама, не было дня, каб я не ўспамінаў цябе».

❖ Бог, мне сумна.
І Бог даў чалавеку тэлебачанне.
Бог, мне сумна.
І Бог даў чалавеку камп'ютар.
Бог, мне сумна.
І Бог даў чалавеку сотавы тэлефон.
Чалавек пераадрасаваў просьбу.
Мне ўсё роўна сумна, д'ябал.
І д'ябал прымусіў чалавека за ўсё, што даў Бог, плаціць грошы. Больш просьбаў не было. На іх не хапае часу.

❖ Кесары, мытары, фараоны, цэзары, прынцы, князі, баяры, паны, мяшчане, стацкія дарадцы, сакратары абкамаў — усё сышло, не сыходзяць адно багатыя і бедныя.

❖ Вялікая колькасць людзей памрэ і ніколі не пакаштуе французскага шампанскага і ананасаў. Але не меншая колькасць людзей памрэ і ніколі не пакаштуе беларускай самагонкі з салам.

❖ Патрыятызм — гэта ўпрыгожванне Радзімы талентамі і справамі.

❖ Рэлігія — грандыёзны, надзейны метад заспакаення трагічных сумненняў чалавека ад бессэнсоўнасці жыцця.

❖ Жыць адно толькі будучыняй амаль немагчыма. Гэта амаль што даказалі камуністы.

❖ Гэта не бензін падняўся ў цане, гэта мы ўпалі ў жабрацтва.

❖ Калі мужчына страчвае цікавасць у барацьбе за жанчыну, ён пачынае змагацца за месца ў гісторыі.

❖ Калі мы марым пра лепшае заўтра, лепшае сёння непрыкметна мінае.

❖ Новы гальштук не ўпрыгожыць стары касцюм.

Экслібрыс «Звязды»

Гісторыя і сучаснасць — пад адной вокладкай

Культура Беларусі: энцыклапедыя. Т. 1 */ рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. 704 с.: іл.*

У свой час шырокі грамадскі рэзананс выклікала выданне пяцітомнай «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі». Пяцітомнік стаў неабходным для карыстання не толькі вучоным, даследчыкам, але і журналістам, настаўнікам, шараговым чытачам. Мінула з тае пары чвэрць стагоддзя. Беларускія энцыклапедысты пачалі новы творчы і навуковы праект — энцыклапедыю «Культура Беларусі», выданне якой абяцае быць шматтомным. І меркаваць пра гэта можна ўжо хоць бы з улікам таго, што ў першы том увайшлі толькі артыкулы ў межах літар «А-Б». Завяршае том персаналія, прысвечаная Аляксандру Блоку, які, як вядома, у 1916—1917 гг. служыў у войску на Палессі.

Сотні артыкулаў прысвечаныя самым розным пытанням гісторыі культуры, культуралогіі, эстэтыкі, тэатра, выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва... Разглядаюцца літаральна ўсе віды, роды, жанры, жанравыя разнавіднасці беларускай літаратуры і мастацтва. Даюцца звесткі пра культурныя, літаратурныя, навуковыя і мастацкія арганізацыі, што існавалі і існуюць у Беларусі. Ёсць інфармацыя пра ўсе выдавецтвы, газеты, часопісы, пра асобныя кнігавыдавецкія праекты. З цікавасцю чытаюцца старонкі пра бібліятэкі, якія існавалі на тэрыторыі нашай краіны пры кляштарах, манастырах, навучальных установах, з'яўляліся ўласнасцю магнатаў.

Аўтарамі артыкулаў «Культуры Беларусі» з'яўляюцца вучоныя, даследчыкі, якія многімі сваімі працамі пацвярджаюць высокі навуковы аўтарытэт у самых розных галінах — Адам Мальдзіс, Янка Саламевіч, Анатоль Фурс, Ларыса Языковіч, Таццяна Кухаронак, Людміла Дучыц і іншыя. Ужо першы том новага энцыклапедычнага выдання сведчыць, што яно проста абавязана стаць набыткам кожнай бібліятэкі краіны.

Мікола БЕРЛЕЖ.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»

УСТАНАВЛИВАЕТ ПО ОТКРЫТЫМ ДО 17.05.2010 года СРОЧНЫМ БАНКОВСКИМ ВКЛАДАМ В БЕЛОРУССКИХ РУБЛЯХ «СБЕРЕГАТЕЛЬНЫЙ» И «НОВЫЙ 2010» ДОПОЛНИТЕЛЬНЫЙ ДОХОД В РАЗМЕРЕ 5 ПРОЦЕНТОВ ГОДОВЫХ.

Утвержденный размер дополнительного дохода применяется по указанным вкладам с 17.06.2010 года.

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении банка или на сайте http://www.belarusbank.by

Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2009 г., млн бел. руб.

	январь	февраль	март	апрель	май	июнь	июль	август	сентябрь	октябрь	ноябрь	декабрь	2009 год
Вклады до востребования	14,1	73,7	360,4	210,9	168,2	341,1	840,4	968,5	858,2	730,7	994,2	54947,5	60507,8
в том числе: в белорусских рублях	13,5	72,2	358,2	208,5	165,8	337,5	835,2	963,8	852,7	726,5	990,2	54875,4	60399,4
в иностранной валюте	0,6	1,5	2,2	2,4	2,4	3,6	5,2	4,7	5,5	4,2	4,0	72,1	108,4
Срочные депозиты	65366,4	84747,8	99573,7	96978,9	74407,6	103899,5	86888,3	88895,2	93119,3	81314,9	102613,9	128683,1	1106488,8
в том числе: в белорусских рублях	40602,5	55379,7	61011,0	61400,6	41672,6	63738,9	53377,1	55800,9	58435,2	51325,4	70984,0	86554,4	700282,5
в иностранной валюте	24763,9	29368,1	38562,7	35578,3	32735,0	40160,6	33511,2	33094,3	34684,1	29989,5	31629,9	42128,7	406206,3

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ПСІХІЧНАЕ ЗДАРОЎЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ... АД ХАРЧАВАННЯ?

Даследчыкі з Канады даказалі сувязь паміж харчовымі паводзінамі і псіхічным здароўем чалавека. Згодна са звесткамі, якія сабралі навукоўцы, у найбольшай ступені падвержаны псіхічным захворванням людзі, якія аддаюць перавагу так званаму хутказ харчаванню ці фаст-фуду. І сувязь тут самая прамая, паколькі менавіта людзі, якія аддаюць перавагу хуткаму харчаванню, каб не марнаваць час на чаканне, дэманструюць павышаную трывожнасць, нецярплівасць і, як наступства, значна часцей церпяць ад псіхічных расстройстваў.

Акрамя таго, спецыялісты заўважылі, што людзі, якія прызвычаіліся да фаст-фуду, пастаянна спяшаюцца, імкнучыся зэканоміць час, але эканомія атрымліваецца зманлівай, паколькі нежаданне спыніцца і падумаць прыводзіць да таго, што чалавек здзяйсняе ўсе пакупкі ў спешцы, а гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да таго, што чалавек набывае прадукцыю нізкай якасці па дастаткова высокай цане. Гэта толькі павялічвае незадаволенасць чалавека, што, у сваю чаргу, можа паслужыць прычынай развіцця псіхічных расстройстваў.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Вось так заўсёды — чакаеш-чакаеш вясну, рыхтуешся, купіш туфлікі, а тут адразу бац! — і лета, час бегчы за басаножкамі. Пра што гэта я? Зразумела ж пра тое, як ярка свеціць сонейка і якія цёплыя і прыемныя ідуць дажджы, а таксама пра тое, як імкліва таннеюць на рынках гурочкі, памідорчыкі, радысачка і іншая гародніна-садавіна, па якіх сумавалі ўсю зіму. Сёння будзем гатаваць усё просценькае і смачненькае, адпаведна настрою!

Салата просценькая

Вазьміце: *2 вараныя яйкі, памідор, кукурузу ў бляшанцы, салату ліставую, сухарыкі, соус «Ранч» (можна купіць гатовы, можна прыгатаваць самім).*

Парэзаць яйкі, памідор. Лісце салаты парваць. Скласці ўсё гэта ў салатнік, дадаць кукурузу. Заліць соусам, размяшаць і зверху высыпаць сухарыкі.

Рэцэпт соусу «Ранч»

Пры такой прастаце рэцэпту, якую я так паважаю, смак соусу проста цудоўны! Кіславата-востранькі, вельмі свежы.

Змяшаць 4 сталовыя лыжкі маянэзу, 4 сталовыя лыжкі кефіру або несалодкага ёгурту, 2 чайныя лыжкі цукру, 2 чайныя лыжкі віннага воцату або 1 сталовую лыжку лімоннага соку (дозу можна добра павялічыць на смак), 1 чайную лыжку сухой здробненай пятрушкі і столькі ж сухога здробненага кропу, белы перац (на смак, але не менш за палову чайнай лыжкі).

Духмяныя тэфтэлькі

Нам спатрэбіцца: *400 г фаршу, 1/2 цыбуліны, 1 зубок часнаку, 1 сталовая лыжка пасечанай пятрушкі, 1 чайная лыжка натаркаванай цэдры лімона, 1 яйка, 2 скібачкі хлеба для тостаў, соль, перац. Для падлівы: 1 сталовая лыжка сметанковага масла, 1 сталовая лыжка мукі, 500 мл мяснога булёну, 1 лаўровы ліст.*

Дробна пасячы цыбулю і часнок, замачыць мякіш у вадзе. Змяшаць у месцы ўсе інгрэдыенты, добра вымешаць і прыгатаваць невялікія тэфтэлькі. Растапіць масла ў каструлі, падсмажыць муку, уліць гарачы булён і даць пакіпець. Тэфтэлькі вылажыць у белы соус, дадаць лаўровы ліст, прыкрыць накрыўкай і гатаваць на павольным агні 20 хвілін.

Торт Святочны

Торцік гатуецца вельмі проста, а атрымліваецца надзвычай смачна.

Вазьміце: *100 г сметанковага масла для цеста і 300 г для крэму, 4 яйкі, 200 г цукру для цеста і 300 г для крэму, 1 сталовую лыжку смятаны для цеста і 500 г для крэму, 1/2 чайнай лыжкі соды, 200 г мукі, 500 г чарнасліву, 100 г здробненых грэцкіх арэхаў.*

Для цеста масла расціраеце з яечнымі жаўткамі і цукрам, дадаяце смятану, соду (пагасіць воцатам), муку. Замешваеце цеста і выпякаеце тры каржы.

Для крэму распараны і ачышчаны ад костачак чарнасліў прапускаеце праз мясарубку. Масла ўзбіваеце з 100 г цукру. Смятану таксама ўзбіваеце з 100 г цукру. Абедзве сумесі змешваеце, дадаяце арэхі і чарнаслівў. Праслойваеце каржы крэмам, зверху змазваеце торт узбітымі з 100 г цукру яечнымі бялкамі.

Салата «Майская»

Нам спатрэбіцца: *500 г адвараного курынага філе, 200 г шампіньёнаў, 400 г зялёнага гароху (кансерваванага), сок паловы лімона, кроп, маянэз, соль, алей.*

Філе парэзаць кубікамі. Дадаць сок лімона, перамяшаць, пакінуць на 1 гадзіну. Грыбы пачысціць, парэзаць лустачкамі і абсмажыць на алеі. Кроп дробна парэзаць. Змяшаць філе, гарох, грыбы, кроп, усё крыху пасаліць і заправіць маянэзам.

Рыба, запечаная на хлебе

Прыгожая і смачная шматпавярховая страва. Яна, безумоўна, святочная, хоць гатуецца лёгка і хутка.

Вазьміце: *800 г філе рыбы (пажадана — сёмгі, лосося, кеты, фарэлі), 2 чайныя лыжкі лімоннага соку, 200 г жытнёвага ці 150 пшанічнага хлеба, 400—500 г брокалі, 200 г смятаны, 1 яйка, соль, перац, спецыі для рыбы.*

Рыбу можна парэзаць скібачкамі або пакінуць цэлым кавалкам. Паліць рыбу лімонным сокам. Пасаліць, паперчыць і пасыпаць спецыямі. Пакінуць на час падрыхтоўкі соусу.

Замарожаную брокалі размарозіць да мяккасці і зліць выдзеленую ваду. У ёмістасць блэндэра разбіць 1 яйка, наліць смятану, палажыць 0,5 ч. лыжкі солі, перац і капусту. Узбіць да аднароднасці.

Глыбокую форму для запякання змазаць алеем. Хлеб парэзаць скібачкамі таўшчынёй 1,5—2 см і выкласці на дно формы так, каб не было прасветаў. На хлеб палажыць рыбу. На рыбу выліць соус. Паставіць у разагрэтую да 200—220 °С духоўку і выпякаць ад 40 хвілін да 1 гадзіны 10 хвілін — у залежнасці ад таго, была рыба парэзаная ці засталася адным кавалкам. Праз 25—30 хвілін ад пачатку запякання форму можна прыкрыць лістом фольгі, каб паверхня соусу не вельмі зарумяньвалася.

ЯДОМЫ АНЕКДОТ:

У нядзельнай школе настаўнік спытаў:

— Джоні, як ты думаеш, Ной шмат рыбачыў, знаходзячыся ў каўчэгу?

— Не, — адказаў Джоні. — У яго было толькі два чарвякі.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

НА КРЫЛАХ НАТХНЕННЯ

Майстар ФМЖД мінчанін Віктар Шульга стварае свае шашачныя творы толькі ў тыя хвіліны, калі яму захацелася гэта зрабіць з ахвотай, як кажуць, ад усёй душы. Таму яны атрымліваюцца шчырымі, адкрытымі для ўсіх рашальнікаў. А бывае — і не зусім простымі, у чым пераканаецца ў рамках яго аўтарскага конкурсу-10/15:



Белыя: a3, c7, d6, e1, e7, f2 (6). **Чорныя:** a5, b4, b8, c3, c5, d4, h2, h4 (8). Выйгрыш.

ПАМЯЦІ ВЕТЭРАНА

Міхаіл Міхайлавіч Станоўскі быў ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і спорту. У шашках меў ганаровыя званні майстра спорту СССР і суддзі ўсесаюзнай катэгорыі. Прысвечаны яго светлай памяці конкурс працягваем заданнямі Пятра Шклудава (Наваполацк) і вядучага рубрыкі:



№ 6. **Белыя:** a5, b4, b6, c5, d6, e5, e7, f6, g7 (9). **Чорныя:** a3, a7, b2, b8, c3, d2, d8 (7). Перамога белых.

№ 7. **Белыя:** a5, b4, d6, e5, e7, f6, g7, h2 (8). **Чорныя:** a3, a7, b2, c3, d2, d4, d8, h4 (8). Тут ідэя ажыццяўляецца трохі інакш.

ЯКАСНА І ПРЫГОЖА

Менавіта так выглядаюць камбінацыйныя праблемы на 100-клетачнай дошцы гросмайстра СССР Леаніда Вітошкіна (Гомель). Наступную з іх ён даслаў у рэдакцыю для **бліца-54/1**:



Белыя: 15, 17, 27, 28, 38, 42, 45, 49 (8). **Чорныя:** 4, 10, 13, 19, 34, 40, 41 (7). Белыя двойчы выкарыстоўваюць правіла збівання большасці шашак і дасягаюць перавагі ў эндшпілі.

Пераможцу конкурсу чакае прыз.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі»**.

БЛІСКУЧАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ

Яго прадэманстравалі беларускія каманды на чэмпіянаце Еўропы па шашках-100. Міжнародныя гросмайстры Анатоль Гантварг, Яўген Ватуцін і міжнародны майстар Андрэй Толчыкаў прывезлі дамоў з Таліна залатыя медалі, а міжнародны гросмайстар Ірына Пашкевіч і майстар ФМЖД Вольга Федаровіч — сярэбраныя.

Намеснік старшыні ГА «Беларуская федэрацыя шашак» Віталь Варушыла перадаў па электроннай пошце запамінальны эпізод з гэтых спаборніцтваў:

Белыя (Петрула): 28, 33, 37, 38, 43, 45, 47 (7). **Чорныя** (Толчыкаў): 13, 14, 17, 18, 19, 26, 27 (7). Белыя пайшлі 1. 37-32 і трапілі пад удар. Пад які?

Прозвішчы тых, хто яго ўкажа, будуць надрукаваныя.

КАЛЕЙДАСКОП

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Вадалеяў чакае прыліў творчай энергіі, а Львоў — прасоўванне па кар'ернай лесвіцы

ВАЕН. Не знойдзецца больш мэтанакіраваных людзей, чым прадстаўнікі знака Авена. Вы зможаце справіцца практычна з любой справай, калі будзеце мець хоць мінімальнае ўяўленне пра тое, як гэта робіцца. Аб рашэнні назапашаных праблем гаварыць нават не прыходзіцца. У аўторак вы можаце паддацца ўспышкам гневу і раздражняльнасці. З сабой змагацца цяжка, але памятайце, што павышаная агрэсіўнасць з вашага боку можа перашкодзіць ажыццяўленню вамі ж вызначаных планаў.

ЦЯЛЕЦ. Могуць чакаць прыкметныя змены ў адносінах з калегамі або партнёрамі. Ад вас запатрабуецца здольнасць да супрацоўніцтва і юрыдычная граматнасць. Працягвайце наладжваць сувязі з дзелавымі партнёрамі з іншых гарадоў або краін — на гэтым тыдні на рэдкасць спрыяльныя магчымасці для гэтага. У першай палове тыдня паспрабуйце не саспаваць адносіны з людзьмі — хто ведае, у які момант вам спатрэбіцца дапамога навакольных?

БЛІЗНЯТЫ. З'явіцца бліскучы шанц справіцца з тактычнымі задачамі. У пятніцу не варта шмат гаварыць, а тым больш крычаць, пажадана сачыць за сваімі словамі і праяўляць стрыманасць. Памятайце, што маўчанне нездарма лічаць золатам.

РАК. Інтуіцыя дапаможа спланаваць падзеі найбліжэйшай будучыні, што, несумненна, пойдзе на карысць не толькі вам, але і навакольным. У панядзелак дзелавыя інтарэсы ўвойдуць у супярэчнасць са старым сяброўствам. Зоркі рэкамендуюць не грэбаваць сябрамі. Серада можа падарыць вам некалькі шанцаў, адзін перспектыўнейшы за другі. Калі нельга схапіць усё, лавіце за хвост той, які больш за ўсё цікавіць.

ЛЕЎ. Рэкамендуецца засяродзіць усю ўвагу на прафесійнай дзейнасці і стабілізацыі фінансавага становішча. Магчыма, вас абнадзеяць справы на працы. Верагодна досыць хуткае пасоўванне па кар'ернай лесвіцы. Паспрабуйце не заганярыцца гэтай акалічнасцю. Прыцішце свае амбіцыі, інакш могуць быць канфліктныя сітуацыі — як з начальствам, так і з калегамі.

ДЗЕВА. Непажадана мітусіцца і спяшацца. Плывучы супраць плыні, вы толькі дарма выдаткуеце каштоўныя сілы. На працы вядзіце справы граматна, прадумвайце кожную дробязь — і тады ўсё атрымаецца. У аўторак лепш не паказвацца на вочы начальству, каб пазбегнуць канфліктнай сітуацыі. Чацвер — выдатны дзень для праявы творчых задум. Вам можа спатрэбіцца парада і дапамога сяброў — і вы гэта ўсё атрымаеце, калі будзеце больш тактоўнымі.

ШАЛІ. У справах прафесійных спатрэбіцца нечаканы падыход і хуткая рэакцыя на змену сітуацыі. Не варта разлічваць на імгненныя вынікі і значны прыбытак. Спяшацца давядзецца толькі вам — усё астатняе будзе адбывацца паступова. Асабліва разлічваць на дапамогу навакольных цяпер не варта. У чацвер высокая верагоднасць заключэння выгодных дамоў і карысных знаёмстваў.

СКАРПІЁН. Надыходзіць няпросты тыдзень, бо, хутчэй за ўсё, у вас назапасілася шмат спраў, якія лепш выканаць, не адкладаючы. У панядзелак неістотная, на першы погляд, дэталь, магчыма, перашкодзіць давесці пачатую справу да канца. Некаторыя няўвязкі ў справах могуць пераследаваць вас, але ў сярэдзіне тыдня абставіны зменяцца ў лепшы бок. У сераду інтуіцыя падкажа дакладнае рашэнне ў сітуацыі, якая склалася.

СТРАЛЕЦ. Вас чакае добры тыдзень: спрыяльныя магчымасці. У панядзелак загадайце жаданне — і яно можа збыцца. Вырашайце ўсе справы без мітусні і спешкі. Не лянуйцеся звярнуцца да мінулага досведу, бо прымаць рашэнні з нуля вас ніхто не прымушае. Неабходна праявіць ініцыятыву і адвагу. У рашучых дзеяннях вам спатрэбіцца падтрымка калег, сяброў і сваякоў.

КАЗЯРОГ. Не варта фарсіраваць падзеі. Проста не звяртайце на іх увагі — тады цяжкасці расступяцца перад вамі самі сабой. З'явіцца магчымасць выдатна павандраваць і ўзбагаціць сябе новымі ўражаннямі. У панядзелак можаце апынуцца зусім блізка да жаданага і нават яго атрымаць, калі не будзеце разменьвацца на дробязі.

ВАДАЛЕЙ. Можаце адчуваць прыліў творчай энергіі. У вас ёсць шанц многага дасягнуць, але пазбягайце пустых гутарак. Лёс прапануе пайсці на абдуманую рызыку і дапаможа дамагчыся поспеху. Праца можа запатрабаваць максімальнай аддачы сілаў і часу — аб'ектыўна ацаніце свае рэальныя магчымасці. Хуткасць рэакцыі, сабранасць і ўменне каардынаваць свае дзеянні з блізкімі або калегамі прынясуць добрыя вынікі.

РЫБЫ. Час адпачынку ззаду, наступіў перыяд напружанай працы. Неабходна будзе мабілізаваць усе свае сілы і магчымасці для рашучага рыўка. Не звяртайце ўвагі на дробныя няўдачы, бо яны не змогуць паўплываць на ваш поспех. Навакольныя будуць добразычліва ставіцца да вашых пачынанняў. Варта быць больш сабранымі і разборлівымі ў зносінах.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 31 МАЯ 2010 ГОДА ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской центр недвижимости

по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) специфических сооружений для установки объектов сезонной мелкорозничной торговли квасом в весенне-осенний период в г. Минске

№ лота	Адрес специфического сооружения для размещения объекта сезонной мелкорозничной торговли плодоовощной продукцией	Арендуемая площадь, кв. м	Начальная цена, тыс. руб.
Заводской район г. Минска, тел. 295-77-81, 296-40-92			
1.	д/с «Чижовка»	5	1000
2.	пер. Промышленный, 12а (возле ООО «ОМА»)	5	1000
3.	пер. Промышленный, 9	5	1000
4.	ул. Варвашени, 6	5	1000
5.	ул. Голодеда, 13	5	1000
6.	ул. Голодеда, 63	5	1000
7.	ул. Жилуновича, 12	5	1000
8.	ул. Кабушкина (ост. «Молодежный поселок»)	5	1000
9.	ул. Нестерова, 51	5	1000
10.	ул. Нестерова, 63	5	1000
11.	ул. Райниса, 17	5	1000
12.	ул. Ташкентская, 16	5	1000
13.	ул. Уборевича (ост. «10-я больница»)	5	1000
Ленинский район г. Минска, тел. 223-06-40, 223-59-20			
14.	пр. Рокоссовского, 145 (ост. «Малинина»)	5	1000
15.	ул. Гашкевича, 10	5	1000
16.	ул. Игуменский тракт, 32 (около отдела по гражданству и миграции)	5	1000
17.	ул. Малинина, 30 (общежитие)	5	1000
18.	ул. Плеханова, 127 (ост. около 7-й детской поликлиники)	5	1000
19.	ул. Плеханова, 72 (около Дома быта)	5	1000
20.	ул. Рыбалко, 2	5	1000
21.	ул. Сырокомли, 38	5	1000
22.	ул. Тростенецкая, 5 (Дом культуры «Элема»)	5	1000
23.	ул. Я. Лучины, 14	5	1000
24.	ул. Я. Лучины, 40	5	1000
Московский район г. Минска, тел. 200-97-69, 200-96-21			
25.	2-й пер. Р. Люксембург, 80/1	5	1000
26.	парк по пр. газеты «Правда»	5	1000
27.	пр. газеты «Звязда», 3	5	1000
28.	пр. Любимова	5	1000
29.	пр. Любимова, 41	5	1000
30.	ул. Гурского, 44/2	5	1000
31.	ул. К. Либкнехта, 122	5	1000
32.	ул. К. Либкнехта, 80	5	1000
33.	ул. Космонавтов, 27	5	1000
34.	ул. Р. Люксембург (парк «Полянка»)	5	1000
35.	ул. Семашко, 8	5	1000
36.	ул. Я. Чечота, 25	5	1000
Октябрьский район, т. 224-49-95, 224-59-12			
37.	пер. Вузовский, 16а	5	1000
38.	пер. Линейный, 3 (ост. пункт) (торговля из кег)	5	1000
39.	ул. Асаналиева, 2 (торговля из кег)	5	1000
40.	ул. Асаналиева, 2	5	1000
41.	ул. Бабушкина, 14	5	1000
42.	ул. Бабушкина, 25	5	1000
43.	ул. Бабушкина, 39	5	1000
44.	ул. Барамзиной, 12 (микрорайон «Сокол»)	5	1000
45.	ул. Брестская, 56/1	5	1000
46.	ул. Володько – ул. Воронянского (ост. пункт)	5	1000
47.	ул. Воронянского, 7а (ост. пункт) (торговля из кег)	5	1000
48.	ул. Жуковского, 2 (торговля из кег)	5	1000
49.	ул. Казинца (ост. «Мясокомбинат») (торговля из кег)	5	1000
50.	ул. Казинца, 120 (ост. пункт) (торговля из кег)	5	1000
51.	ул. Казинца, 91 (торговля из кег)	5	1000
52.	ул. Кижеватова – МКАД (ост. пункт) (торговля из кег)	5	1000
53.	ул. Кижеватова, 80/1 (торговля из кег)	5	1000
54.	ул. Корженевского (д/п «Корженевского»)	5	1000
55.	ул. Корженевского (ост. «Интеграл») (торговля из кег)	5	1000
56.	ул. Корженевского, 25	5	1000
57.	ул. Московская, 15 (торговля из кег)	5	1000
58.	ул. Серова, 15	5	1000
59.	ул. Серова, 3а	5	1000
60.	ул. Стебенева, 6 (торговля из кег)	5	1000
61.	ул. Суражская (возле цветочного ряда) (торговля из кег)	5	1000
62.	ул. Чкалова, 17 (торговля из кег)	5	1000
63.	ул. Чкалова, 38. корп. 3	5	1000
64.	ул. Чкалова, 3а (торговля из кег)	5	1000
Партизанский район, т. 294-70-94, 294-61-44			
65.	ул. Ваупшасова (ост. «ММЗ»)	5	1000
66.	ул. Запорожская (кольцо)	5	1000
67.	ул. Карвата, 17	5	1000
68.	ул. О. Кошевого (разворотное кольцо)	5	1000
69.	ул. Радиальная, 36	5	1000
70.	ул. Смоленская, 2а	5	1000
71.	ул. Солтыса, 191	5	1000
72.	ул. Столетова – 2-й пер. Багратиона	5	1000
73.	ул. Уральская – ул. Менделеева (АТС)	5	1000
74.	ул. Филимонова, 8	5	1000
Первомайский район, т. 280-54-65, 287-30-42			
75.	ул. Волгоградская, 4 (возле столовой) (торговля из кег)	5	1000
76.	ул. Волгоградская, 45 (возле магазина) (торговля из кег)	5	1000
77.	ул. Волгоградская, 5 (возле магазина светильников) (торговля из кег)	5	1000
78.	ул. Калиновского, 55 (возле магазина «Продвильнюс») (торговля из кег)	5	1000
79.	ул. Никифорова, 2 (возле ресторана «Мираж») (торговля из кег)	5	1000
80.	ул. Острошицкая, 3а (возле магазина) (торговля из кег)	5	1000
81.	ул. Уручская, 19 (возле рынка) (торговля из кег)	5	1000
82.	ул. Я. Коласа, 36 (возле магазина «Подарки») (торговля из кег)	5	1000
83.	ул. Я. Коласа, 48 (возле магазина «Семена») (торговля из кег)	5	1000
Советский район, т. 292-81-80, 292-13-93			
84.	пересечение ул. Кропоткина – ул. Кульман (на остановке)	5	1000
85.	пересечение ул. Некрасова – ул. Карастояновой	5	1000
86.	ул. Кольцова, 55	5	1000
87.	ул. Л. Беды, 19	5	1000
88.	ул. Мирошниченко, 55 (на остановке)	5	1000
89.	ул. Я. Коласа, 65 (в торце жилого дома)	5	1000
90.	Цнянское водохранилище, площадка № 1	5	1000
91.	Цнянское водохранилище, площадка № 2	5	1000
92.	Цнянское водохранилище, площадка № 3	5	1000
Фрунзенский район, тел. 204-31-06, 204-40-76			
93.	ул. Д. Сердича, парк 60-летия Октября (вход в парк)	5	1000
94.	ул. Матусевича, 20, парк 60-летия Октября (парковая зона)	5	1000
95.	ул. Колесникова – ул. Масюковщина (остановка общественного транспорта)	5	1000
96.	ул. Лобанка, 58	5	1000
97.	ул. Лынькова, 57, бывший военный городок «Масюковщина»	5	1000
Центральный район, т. 306-42-95			
98.	микрорайон «Веснянка», пр.Победителей, 83 (за ЖЭС-97)	5	1000
99.	микрорайон «Новинки», Долгиновский тракт – ул. Выготского (остановка общественного транспорта перед жилым домом № 1а по ул. Выготского)	5	1000
100.	Набережная Комсомольского озера со стороны пер. Нововиленского (на аллее)	5	1000
101.	ул. Карастояновой (троллейбусное депо)	5	1000
102.	ул. Нововиленская (проходная ОАО «Птицефабрика им. Крупской», возле «Крамы № 2»)	5	1000

Аукцион состоится 31 мая 2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются с 17 мая по 27 мая 2010 г. в рабочее время, 27 мая 2010 г. до 16.00 (обеденный перерыв 13.00 – 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефон для справок (017) 227 40 22; www.mgcn.by.

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на расчетный счет № 3012024570010, филиал ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости»;

- заполняет и подписывает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения торгов, заявления на участие в торгах и об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги (осмотр объектов недвижимости обеспечивают арендодатели);

- физическое лицо предоставляет копию документа, удостоверяющего личность, номер лицевого счета и реквизиты банка, в котором открыт лицевой счет;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации, документ с указанием банковских реквизитов, в случае отсутствия расчетного счета необходимо предоставить номер лицевого счета и реквизиты банка, в котором открыт лицевой счет;

руководитель юридического лица либо его представитель по доверенности – копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, документ, подтверждающий полномочия руководителя, документ с указанием банковских реквизитов.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победитель аукциона для заключения договора аренды обязан зарегистрироваться в качестве субъекта хозяйствования.

Со схемами размещения специфических сооружений можно ознакомиться у организатора аукциона. По вопросам осмотра места расположения специфических сооружений следует обращаться в администрации соответствующих районов.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Арендная плата за специфическое сооружение для установки объектов сезонной мелкорозничной торговли квасом составляет 9 базовых величин в месяц.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

Адрес объекта и его наименование	- здание котельной, общей площадью 178 кв. м, год постройки – 1971, стены кирпичные, перекрытия железобетонные; - здание мехмастерской, общей площадью 604 кв. м; год постройки – 1977; - здание конторы, общей площадью 308 кв. м, год постройки – 1971, стены кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша шиферная; - здание лесопильного цеха общей площадью 308 кв. м, год постройки – 1971; - здание столярной мастерской общей площадью 355 кв. м, год постройки – 1971; - насосная установка, год ввода в эксплуатацию – 1990; - теплотрасса, год ввода в эксплуатацию – 1991. Объекты расположены по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, 225. Объекты продаются одним лотом. Начальная цена – 279 126 000 рублей.
Продавец	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Вилейском райисполкоме
Организатор аукциона	Строительное инвестиционно-коммунальное унитарное предприятие «УКС-Сервис»
Сумма задатка	10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис»
Порядок оплаты за объект Победителем аукциона	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС- Сервис»
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заявление на участие в аукционе, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона в 2-х экземплярах, заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, справку ГНИ об отсутствии задолженности по подоходному налогу.
Конечный срок и адрес приема заявок	31.05.2010 г., до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 75 16 09, 75 19 20 (факс)
Дата, время и место аукциона	01.06.2010 г. в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, СИКУП «УКС-Сервис»
	Аукцион состоится при наличии двух участников на один лот.

УНН 600182305

Утерянные страховые полисы обязательного страхования ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии АЖ № 3565993, страховой полис добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу форма 2РП2РН серии БМ № 0149858, квитанции о приеме наличных денежных средств форма 1-СУ серии КВ №№ 4133190, 4133193, серии КС 0026811, страховой полис универсальный формы 2РН2РП серии БК с № 0023405 СООО «Белкоопстрах» **считать недействительными**.

Вниманию акционеров ОАО «Белсолод»

25 мая 2010 г. по адресу **г. Иваново, ул. Полевая, 32** состоится внеочередное общее собрание акционеров. Начало работы собрания в **13.30**. Время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 13.00 до 13.30.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об утверждении передаточных актов.
2. Об увеличении уставного фонда ОАО «Белсолод».
3. Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций ОАО «Белсолод».
4. Об утверждении порядка размещения акций дополнительного выпуска ОАО «Белсолод» среди членов СПК.
5. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «Белсолод».

УНП 200075434

ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

Извещает своих акционеров, что 1-ая выплата дивидендов по итогам финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год будет осуществляться по адресу: г. Минск, ул. Богдановича, 129 и почтовыми переводами.

Справки по тел.: (017) 334 30 31, 334 34 74.

УНП 100364117

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	**Здание детского сада-яслей с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка**
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., г. Барановичи, пер. Партизанский 3-й, д. 29
Продавец недвижимого имущества	Концерн «Белнефтехим» (в лице ОАО «Бархим»), тел. 016345 43 18
Сведения о предмете аукциона	Здание 1984 г.п., 2-эт., площадь 3058,2 кв.м, 6 теневых навесов, спортплощадка, мусоросборник, забор, 9 декоративных решеток. Земельный участок площадью 0,9285 га, под размещение многоквартирного жилого дома, объектов торговли, по оказанию услуг населению, административного назначения, срок аренды – 50 лет с последующим продлением
Начальная цена предмета аукциона, руб.	920 774 798
Сумма задатка, руб.	92 077 000
Организатор аукциона	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, 80162 20 87 85, 23 12 63, www.brest–region.by

Аукцион состоится **15 июня 2010 года в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 14 июня 2010 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



1	7				5		9	3
		6				7		4
					9	8		1
				6			8	9
8	4			2				
3		1	7					
5		9				3		
4	6		3				1	5

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетак, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (6 мая). Па гарызанталі: Рэпарцёр. Гонг. Эра. Ласт. Качка. Рол. Рота. Опера. Урга. Прыход. Корда. Мыза. Ураган. Кухаль. Іран. Туф. Мазь. Страха. Ляжак. Кіо. Лак. Спад. Зелле. Ляп. Яравіт. Вата. Ірак. Ёрш. Натарыят. **Па вертыкалі:** Шклянка. Фужэр. Лье. Чарка. Імя. Гараж. Хна. Азалея. Пюрэ. Нянька. Род. Клавіш. Галоп. Явар. Алея. Капітан. Нос. Така. Рог. Тракт. Сок. Бурт. Штурм. Рыс. Ардыната. Газ. Лухта. Ежа. Альфа. Джыгіт.

Згубленую картку ўліку парушэнняў правілаў палявання і аплаты дзяржпошліны на імя Антановіча Генадзя Іванавіча **лічыць несапраўднай.**

Любага бацьку і дзядулю **Івана Фёдаравіча ХОДЗІНА**, які жыве ў в. Жыліхава Капыльскага раёна, віншуем з 85-годдзем і з гэтай нагоды зычым добрага здароўя, шчасця і радасці, дабрабыту і спакою, увагі родных.

Дочкі Тамара, Валянціна, сыны Уладзімір, Міхаіл, унукі і праўнукі.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАЧНЫ СЕЗОН

Чым упрыгожыць участак?

Уся зямля на ўчастку адведзена пад карысныя градкі для агародніны? Але прыгажосці ўсё роўна хочацца! Вось некалькі ідэй, як зрабіць на ўчастку мабільны кветнік.

Гэта не толькі прыгожа, але і вельмі зручна, бо пры жаданні вы можаце перамяшчаць яго па ўчастку і нават занесці ў дом. Вам спатрэбяцца скрыні, гаршкі, кашпо і нават старыя чаравікі. У іх цудоўна будуць расці браткі, настурка, аксаміткі — любыя не вельмі высакарослыя кветкі. Гаршкі з кветкамі можна паставіць на ганку, на лаўку пад вокнамі, а кашпо нават падвесіць ля ўвахода ў дом.

Бяжыць ручай

Зрабіце на ўчастку «сухі ручай». Ён ажывіць ваш агарод і зрокава аб'яднае розныя зоны. Для гэтага дастаткова пракапаць канаўкі рознай шырыні і формы. Уздоўж «ручая» можна пасадзіць ліліі, касачы, незабудкі — кветкі, якія асацыююцца з вадою. На дно накідайце дробных каменьчыкаў і крыху рачнога пяску. У дождж канаўкі будуць напаўняцца вадой і ператварацца ў сапраўдны ручай. Ну а ў сухое надвор'е будзе стварацца ўражанне, што ручай перасох з-за спёкі.

САКРЭТЫ КУХНІ

Пра мяту

Мала хто ведае, што мята ў кулінарыі выкарыстоўваецца не толькі для духмянай гарбаты.

- Здробненае лісце мяты кладуць ў пірагі, пячэнне, пернікі. Духмяная трава надае печыву вельмі тонкі пікантны смак. Толькі не трэба перабіраць. Для сярэдняга пірага дастаткова 6-7 лісточкаў.
- Мята не дае сапсавацца малаку. Калі ў яго дадаць некалькі лісточкаў свежай мяты, то малако доўга не скісае.
- У многіх рэстаранах падаюць дэсерты з лісточкамі мяты. Гэта зусім не значыць, што мяту абавязкова трэба есці. Яна служыць дэкаратыўным упрыгажэннем.
- Мяту для духмянага паху дадаюць у кісялі, квасы, кампоты. Можна зварыць звычайны кампот з сушанай садавіны і дадаць крыху мяты — і смак кампоту стане зусім іншым.
- Свежую мяту выкарыстоўваюць пры гатаванні бараніны, ялавічыны і рыбы. Але ў гэтым выпадку не дадаюць іншыя духмяныя прыправы.
- Здробненую мяту можна дадаць у тушаную капусту.
- Сушаную мяту выкарыстоўваюць як прыправу да птушкі ці мясных страў.

БЕЗ РЭЦЭПТА

Квас з буракоў ад ціску

Нарэжце буйныя буракі на тонкія пласцінкі (1х2 см), заліце цёплай гатаванай вадой і пастаўце настойвацца 1 гадзіну, памешваючы драўлянай лыжкай. Працадзіце, пераліце ў эмаліраваную трохлітровую каструлю, дадайце па 3 ст. лыжкі цукру і мёду, 1/3 ч. лыжкі сухіх дражджэй і сок 1 лімона. Старанна перамяшайце, даліце да 3 л гатаванай вадой і пакіньце на стале прыкладна на 12 гадзін пад накрыўкай. Затым зніміце з квасу пену, разліце ў 2-3 пластыкавыя бутэлькі, няшчыльна закруціце і пастаўце ў халадзільнік. Праз 10—12 гадзін квас, які паніжае ціск, гатовы.

-2660-

УТУЛЬНЫ ДОМ

Мастацкае афармленне

Самы мудрагелісты мастацкі беспарадак заўсёды падпарадкаваны адзінай ідэі. Таму, калі вы лічыце, што развесіць карціны ці фотакарткі можна як хочацца і дзе хочацца, абапіраючыся толькі на свой густ, вы глыбока памыляецеся.

Здаецца, такая асабістая справа, але і тут існуюць пэўныя правілы.

- Калі размова ідзе пра адну карціну ці невялікую фотакартку, яе вешаюць у цэнтры пакоя ці там, дзе яна адразу прыцягне ўвагу.
- Спалучаць некалькі разнамасных карцін ці фатаграфій няпроста. Насценныя ўпрыгажэнні любяць парадак і сіметрыю. Іх неабходна выраўноўваць па адной гарызанталі — ці па верхнім краі, ці па ніжнім.
- Сапраўдным упрыгажэннем будуць вывешаныя на аднолькавай адлегласці адзіныя па стылі рэпрадукцыі ў два ці нават тры рады (усё залежыць ад іх памеру). Тады атрымаецца вялікі яркі квадрат ці прамавугольнік. Пры гэтым рэпрадукцыі могуць быць з аднолькавым малюнкам. Лепш, калі з абстрактным.

- Але што рабіць, калі ўсё, што хочацца павесіць на сцяну, моцна адрозніваецца па памерах? Тады з маленькіх прадметаў трэба скласці калаж, блізкі па памерах да вялікіх карцін, і гэтак жа размясціць яго на адным узроўні з іншымі карцінамі. Можна для гэтага навесіць неглыбокія паліцы і на іх расставіць карціны.
- Зусім не абавязкова вешаць карціны «пад столь», лепш, калі яны будуць размяшчацца на ўзроўні вачэй. Добра, калі вы зможаце зрабіць падсвечванне: гэта выгадна падкрэсліць работы і стварыць дадатковую ўтульнасць.
- Калі ў вашым доме няма карцін, а фотакарткі не настолькі добрыя, каб вывесіць іх на ўсеагульны агляд, вы можаце ўпрыгожыць сцены вырабамі, зробленымі сваімі рукамі.
- Цяпер прадаюцца прыгожыя аб'ёмныя рамачкі, пад шклом якіх лёгка стварыць любую рамантычную «карціну». Гэта можа быць кампазіцыя са штучных кветак і свечкі, выкладзеных на прыгожа здрапіраванай тканіне. Для дзіцячага пакоя стварыце іншыя сюжэты. Любую цацку размясціце «на палянцы» з каляровага сітцу ці экзатычныя ракавінкі «на марскім дне» з блакітнага шоўку ці аксаміту. Выберыце самыя лепшыя малюнкі вашага дзіцяці і змясціце ў рамкі, атрымаюцца сапраўдныя «дарослыя» карціны, якія ажывяць сцены.

Утульнасць вашага дома, у стварэнне якой вы ўклалі душу і працу, будзе радаваць вас нашмат мацней, чым увасабленне чужых думак.

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

Як правільна абнавіць гардэроб

Хочаце абнавіць гардэроб? Для пачатку трэба вызначыцца, якімі рэчамі вы часцей за ўсё карыстаецеся, і скласці спіс, чаго не хапае.

У першую чаргу наведайце крамы, у якіх ёсць зніжкі, і яшчэ раз з улікам убачанага прагледзьце складзены спіс. Пры неабходнасці змяніце яго. Далей дзейнічайце ў адпаведнасці з планам. Не трэба губляць час, разглядваючы спадніцы, калі трэба купіць пару блузак.

Набываючы новыя рэчы, варта памятаць, што яны павінны спалучацца па стылі і колеры з тымі, што ўжо ёсць у гардэробе.

Звярніце ўвагу на абутак і аксесуары. Менавіта яны дазволяць нават пры наяўнасці мінімуму рэчаў кожны дзень выглядаць па-новаму. Набываць трэба толькі якасныя рэчы, каб праз тыдзень не давялося зноў хадзіць у пошуках новай сумачкі і шкадаваць пра дарэмна патрачаныя час і грошы.

-2661-

Два полюсы

НАВОШТА, ДЗЯЎЧАТЫ, ВЫСОКІХ КАХАЕЦЕ?

Адразу адзначу, што мой рост — ніжэй за 170 сантыметраў. Комплексаў наконт гэтага ўжо даўно няма. Ці ёсць? Калі дакладна, рост 169 сантыметраў. Ну, прызнаюся, 168...

У савецкую армію ў свой час узялі, а, памятаецца, карлікам туды позвы не выпісвалі. Дарэчы, пра армію. Напрыклад, пехацінцу, вядома, трэба быць ніжэй. Бо, у прыватнасці, у адкрытым полі ў каго лепш пацэліць вораг? А танкістаў ростам пад 190 сантыметраў я ніколі не бачыў. Выходзіць, невысокія салдаты — проста «знаходка» для арміі любой краіны.

Як невысокі, хачу нагадаць, што шмат знакамітых людзей былі такімі ж. Вось чытаў пра Напалеона, напрыклад. А Гагарын? Калі не пераблытаў, не 180 сантыметраў быў ростам. Высокі не мог быць першым касманаўтам з-за абмежаванай жылой плошчы касмічнага карабля. Ці я памыляюся? А былы і цяперашні прэзідэнты Расіі? Невысокія зусім. Жанчыны на гэта скажуць: «Ты ж не Напалеон! І не прэзідэнт!» Затое таксама невысокі.

Між іншым, заўважыў, што за рэдкім выключэннем мужчыны-чыноўнікі ў Прыдзвінскім краі ростам за 180 сантыметраў. Асабіста я тлумачу гэты факт тым, што пераважная большасць з іх — выхадцы з глыбінкі. На хатнім малацэ, сале, на свежым паветры, апрацоўваючы зямлю з дзяцінства, і вырасцеш высокім, моцным. Ніякім чынам не хацеў нікога пакрыўдзіць. Проста назіранне і разважанне.

Высокі, моцны, прыгожы. А яшчэ каб не піў, не курыў, і кветкі заўсёды дарыў. Усё, як у тым савецкім шлягеры — мара, бадай, кожнай дзяўчыны. Напэўна, высокі рост асацыюецца ў дзяўчат з той самай «крэпасцю». «Я за ім, — разважае дзяўчына, — як за каменнай сцяной». І чым вышэй сцяна, тым лепш.

Пры ўсім тым, што жыццё часта кардынальна мяняе ўяўленні жанчын пра іх будучых мужоў. Вось маці маіх дзяцей таксама да сустрэчы са мной кахала высокіх. І вось «сумны» для яе вынік. Мяне не кахае, а два хлопцы растуць. І добра! Толькі ўсё пераживае — ці будуць дзеці такія ж, як я. Рост у нас з ёй аднолькавы. Затое мой цесць — ну проста ідэал у сэнсе росту. Разведзены тым болей.

Нядаўна пазнаёміўся з жанчынай. Ёй за трыццаць. Свабодная. Пачаў фліртаваць. Ах, вясна, вясна. І пагаварыць з ёй пра што ёсць. Але ж падчас шчырых размоў пра жыццё высветлілася, што яна любіць толькі высокіх. І чамусьці ўрэшце зрабіла захад, што я пакрыўдзіўся з-за яе гэтых слоў. Потым напісала мне на электронны адрас, што не супраць новых сустрэч па-за супрацоўніцтвам паміж рэдакцыяй і яе фірмай. Вось і зразумей жаночую логіку.

Другі прыклад з асабістага жыцця. Перапісваўся з жанчынай з глыбінкі. Прыехаў у камандзіроўку, і так ужо здарылася, што сустрэўся з яе калегамі-жанчынамі. На жаль, у гэты дзень яе ў родным горадзе не было. Тыя, вядома, ёй перадалі пра візіт журналіста са «сталіцы». Не забылі пра тое, што рост яго такі, што «толькі абдымі і заплач». Потым я ёй патэлефанаваў. Яна пра перажыванні наконт сустрэчы, якая, на жаль, не адбылася. І раптам пра рост: «Я думала, што ты не такі маленькі»... Дык навошта мне далей мець стасункі з чалавекам з комплексамі?

Ёсць у мяне таварыш. Таксама невысокі. 40 гадоў. Халасцяк. У свой час тыя, хто яму падабаліся, адмовілі яму ў самі здагадаецеся чым, таму што «карлік». Як кажуць, прайшлі гады. Большасць з тых, хто не хацелі быць калісьці з ім, развяліся. І ў прынцыпе, наколькі я разумею гэтых жанчын, цяпер былі б не супраць мець блізкія стасункі з чалавекам з залатымі рукамі, з добрай зарплатай. Тым больш што ён фактычна не ўжывае спіртное. І не матулін сынок. Жыве адзін у двухпакаёвай кватэры. Ды і ў добрым раёне (недалёка Летні амфітэатр — галоўная сцэнічная пляцоўка музычнага «базару»). Тэлефон магу падарыць чытачкам, якіх гэтая інфармацыя зацікавіць.

Лічу, што комплексы не ў пераважнай большасці невысокіх хлопцаў, а ў тых, хто менавіта па гэтай прыкмеце — высокага росту — выбірае сабе партнёраў.

Пра мужчынскія комплексы. Тып ідэалу многіх мужчын: бландзінка з доўгімі нагамі, вялікімі грудзьмі, блакітнымі вачамі. Быў і ў мяне такі комплекс. Выбраў фарбаваную бландзінку.

Дарэчы, наконт бландзінак. Чаму лічыцца, што яны ў большасці сваёй, мякка кажучы, «неразумныя»? Такія ж ёсць і сярод брунетак, шатэнак... Быў бы чалавек добры. А якога колеру ў яго валасы — гэта ўжо другасны фактар.

Верагодна, яшчэ з часоў зараджэння чалавецтва жанчыны цягнуліся фізічна да высокіх мужчын (чытай: самцоў). У наш час мы засталіся такімі ж прымітыўнымі? Толькі замест прымітыўных «штук» для палявання высокія тэхналогіі? І ў XXI стагоддзі падавай жанчынам высокіх? Каб не соромна было выйсці ў горад, як адзначыла мая знаёмая. Упэўнены, што даволі хутка жанчыны пазбавяцца ад комплексаў. А калі не? Ну, пакахаў «карлік» жанчыну, а яна яму адмаўляе. Адразу задаю пытанне — навошта яна яму такая? І парадую — пры сучасных дасягненнях медыцыны магчыма штучна павысіць рост. Яшчэ ў часы СССР, памятаю, у часопісах расказвалася, як падчас аперацыі можна вырасці сантыметраў на 10. Плюс спецыяльныя заняткі для расцяжкі і без хірурга «падымуць у вышыню». А ці трэба? Галоўнае ж — унутры!!!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КАЖУЦЬ, ШТО ГАЛОЎНАЕ — ДУША... А ГЛЯДЗЯЦЬ НА ГРУДЗІ!

Прачытала «комплексное даследаванне» калегі, і першым жаданнем было адказаць штосьці ў стылі — самі такія. Маўляў, дарагія крытыкі ружовых дзявочых мараў, растлумачце лепш, чаму джэнтльмены аддаюць перавагу бландзінкам, і дастаткова перафарбавацца (праверана на ўласным вопыце), каб табе дазвалялі і даравалі значна больш, чым раней? Або з якога гэта перапруду, на думку мноства мужчын, дзяўчаты, большыя за 46-ы памер, асуджаныя на адзіноту і выміранне як від? Ці так: чаму 99 адсоткаў мужыкоў сцвярджаюць, што ў пошуках ідэальнай палавінкі важная не знешнасць, а душа (і яе люстэрка — вочы), а самі пры сустрэчы глядзяць хто на ногі, хто на грудзі?!

Карацей, шмат чаго можна было напісаць у адказ — хапіла б на таўшчэзны жаночы раман, з эпіграфам і эпілогам. Але я ўсё ж пастаралася адкінуць суб'ектыўнае жаданне ўзводзіць прыватнасці ў абсалют і паспрабавала ўнікнуць у сутнасць праблемы.

Сказаць, што яе ўвогуле не існуе, не выпадае — сама не раз была сведкай, калі партнёра характарызаваў і нашмат даўжэйшы спіс ідэальных параметраў, чым «высокі, моцны, прыгожы, каб не піў, не курыў, кветкі дарыў», заўжды мяне адну кахаў і добра зарабляў. Але ставіцца да гэтага спісу, на маю думку, варта з усмешкай. Можна са скептычнай, можна з добразычлівай — каму як больш падабаецца. Бо жыццё сапраўды мудрэйшае за нас, і з цягам часу ўсё расстаўляе па належных месцах. Я, прызнаюся, у падлеткавым узросце таксама марыла, уяўляла з сабой гэткага высачэзнага асілка, пры тым і добрага, і разумнага, і спартыўнага — карацей, толькі што без белага каня. Але ж. Знайшла, на сваю галаву — пра такі тыпаж мая бабуля казала «шафа з антрэсолямі». Толькі вось потым высветлілася, што «антрэсолі» ў асноўным пустыя, нецвярозы асілак — гэта горш, чым малпа за рычагамі танка, і ўвогуле, вялікія шафы гучна падаюць... Або прыяцелька мая дзіўнае мела ўяўленне пра свайго ідэальнага мужчыну: «Ён можа быць усякі — хударлявы ці ўкормлены, высокі ці нізкі, гарадскі ці вясковы, бландзін ці брунет; абы толькі не «рыжий-бесстыжий», цярпець іх не магу!». Ну, і здагадайцеся з трох разоў, якога колеру шавялюра ў яе — да слова, пяшчотна каханага — мужа? Як чалавек, які назіраў іхнюю love story з самага пачатку, заўважу: нічога б не атрымалася, калі б хлопец не ўспрыняў гэтае «цярпець не магу» як часовую дзявочую блазноту, а яна паступова не разгледзела за рудымі валасамі і рабаціннем цудоўнае пачуццё гумару, адказнасць за сябе і іншых і спакойны, разважлівы характар.

Так што не пагаджуся я з табой, Саша, што комплексы — толькі ў тых, хто выбірае партнёра па пэўных вонкавых «тэхніка-тэхнічных характарыстыках». У тых, КАГО выбіраюць, гэтых комплексаў таксама хапае, проста ставяцца да іх людзі па-рознаму: хтосьці прымае і любіць сябе такім, як ёсць, хтосьці выпрацоўвае імунітэт да дурных жартаў на тэму сваёй знешнасці, хтосьці працуе над сабой і ператвараецца з гадкага качаняці ў такога лебедзя, што зайздроснікі потым языкамі душацца, а хтосьці вырашае, што лепшая абарона — гэта напад, і з'едліва крытыкуе заганы іншых. Табе які варыянт больш даспадобы? А, ужо бачу — паглыбленне ў гісторыю і арыентацыя на выбітных асобаў невысокага росту. Таксама няблага. Да ўзгаданых ужо Напалеона (162 см) і Гагарына (па адных звестках, 157, па другіх — 165 см) можаш дапісаць Аляксандра Пушкіна (166 см), Аляксандра Македонскага (150), караля Людовіка XIV (156) і ўвогуле карліка па сучасных мерках, аднак вялікага ў сусветнай гісторыі дзеяча Чынгісхана (145). Праўда, не забывайся, што ў тыя далёкія часы грамадства яшчэ не ведала, што такое акселерацыя. І, тым не менш, усімі гэтымі мужчынамі жанчыны захапляліся і кахалі... Мне асабіста спадабалася выказванне Чарлі Чаплінa (таксама не волат быў, між іншым), што маленькім людзям, незалежна ад полу, даводзіцца прыкласці больш намаганняў, каб вылучыцца з натоўпу — затое поспех да іх, пры належным старанні, прыходзіць вялікі.

Што да разваг, быццам спрадвеку жанчыны цягнуліся да высокіх мужчын — зноў ты не маеш рацыі. Сэксолагі сцвярджаюць, што высокі рост і доўгія канечнасці нярэдка сведчаць, хутчэй, пра слабасць палавой канстытуцыі, і могуць быць прыкметамі пэўных праблем. А інстынкт размнажэння прымушае нас выбіраць таго, хто зможа даць моцных, здаровых нашчадкаў. І вось тут невысокіх мужчын чакае прыемнае адкрыццё: як правіла, мужчыны з высокім тэмпераментам — сярэдняга або ніжэй за сярэдні рост, з прапарцыянальнай постаццю, часта з павышанай валасатасцю. І дасведчаныя жанчыны пра гэта добра ведаюць!

А ўвогуле, папулярнасць таго ці іншага тыпажу знешнасці — гэта ўсяго толькі мода. Спачатку яе прапагандуюць адзінкі, потым падхопліваюць усе, а потым... індпашыў ператвараецца ў шырспажыў, і мода шукае іншы кірунак. Бо доўга знаходзіцца ў асяроддзі жывых манекенаў і карцінак з глянцавых часопісаў — сумна. Так што аднойчы, калі высокіх стане празмерна многа і жанчыны ад іх крыху стомяцца, на сцэну выйдзеш ты — увесь у белым... Тады не забудзься, калі ласка, што ў жанчыне таксама колер валасоў, даўжыня ног ці памер грудзей — далёка не самае важнае.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 14 мая.
Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.07	21.05	15.58
Віцебск —	4.51	21.01	16.10
Магілёў —	4.58	20.56	15.58
Гомель —	5.01	20.45	15.44
Гродна —	5.24	21.19	15.55
Брэст —	5.31	21.13	15.42

Імяніны

Пр. *Зоі, Апанаса, Барыса, Глеба, Давыда, Рамана.*

К. *Надзеі, Соф'і, Ізыдара, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Усміхнемся!

Двое студэнтаў.

— Не гуляй з Сёмам у прэферанс і не пазычай яму грошы.

— Чаму?

— Ён убачыў у мяне ў кашальку пяцьдзесят тысяч, пазычыў пяць да стыпендыі, потым на іх выйграў астатнія.

☺

Каля расплаўленага ваенкамата знайшлі запіску з тэкстам «І больш на хімфак свае позвы не дасылайце!»

☺

Адкрываю раніцай халадзільнік, а там — нічога... Ну, жывы ёгурт!..

☺

Два сябры.

— Хачу на паляванне!

— А я хачу на рыбалку!

— Ну добра, прапаную кампраміс — паехалі страляць рыб!

☺

— А я ўчора жонку з палюбоўнікам застукаў. І адразу пытанне рабром: «Ці я, ці ён!»

— Ну і што?!

— Ну і ўсё, цяпер ён смецце выносіць.

☺

Дыялогі ў сецівe.

— Мне сёння аж тры дзяўчыны сказалі, што я сімпатычны!

— Ты ім інтэрнэт наладжваў?

15 мая

Дзве даты



1845 год — 165 гадоў з дня нараджэння Івана Дзяменцьевіча Чэрскага, вядомага геолага, географа, даследчыка Сібіры. (в. Свольна, сёння Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобл.) Вучыўся ў Віленскім дваранскім інстытуце. За ўдзел у паўстанні 1863-64 гадоў быў пазбаўлены дваранскага звання, грамадзянскіх правоў і сасланы ў Сібір салдатам. У 1871 годзе запрошаны Сібірскім аддзяленнем Рускага геаграфічнага таварыства ў Іркуцк. Праводзіў геалагічныя і палеанталагічныя даследаванні ў Саянах, Прыбайкаллі, у басейне Ангары і Ніжняй Тунгускі. Склаў першую геалагічную карту ўзбярэжжа возера Байкал. У 1885 годзе па запрашэнні Санкт-Пецярбургскай АН пераехаў у сталіцу. У хуткім часе ўзначаліў экспедыцыю ў раён рэк Калыма і Індыгірка. Праз год, падчас даследаванняў нізоўяў Калымы, памёр. Яго імем названы сістэма горных хрыбтоў у Паўночна-усходняй Сібіры, хрыбет у Забайкаллі і інш.

1932 год — Сталін аб'явіў пачатак «бязбожнай» пяцігодкі, паставіўшы мэту: да 1 мая 1937 года на ўсёй тэрыторыі краіны насельніцтва павінна было забыць бога.

Цытата дня:

«Мы заўсёды пачынаем больш паважаць людзей пасля таго, як паспрабуем выканаць іх работу».

Уільш Федэр.

Дзень тыдня як вызначальны фактар лёсу

Мы ўжо неаднаразова адзначалі, што ў сістэме светапоглядных уяўленняў беларусаў кожны дзень тыдня быў надзелены вызначальнымі характэрнымі рысамі. Так, нашы продкі маглі прадказваць будучае чалавека і па тым, у які дзень тыдня ён нарадзіўся.

- Народжаным **у панядзелак** не па сілах вялікія справы. Але ж характар у гэтых людзей, як правіла, рашучы і ўпарты. Многае ў іх жыцці залежыць ад настрою. Калі вы будзеце прыставаць да такога чалавека з маральнымі павучаннямі, то натыкнецеся на жалезабетонную сцяну, а ў крайніх выпадках набудзеце ў яго асобе ворага. Народжаныя ў панядзелак любяць пагаварыць, але больш за ўсё яны любяць, каб іх слухалі і перыядычна хвалілі. Яны ядуць шмат мяса, любяць кветкі.
- Народжаныя **ў аўторак** часцей за ўсё смуглыя, з кароткай спартыўнай стрыжкай, некалькі неахайныя. Аматары складаць байкі, у іх адсутнічае пачуццё сарамлівасці, таму здрады іх не здзіўляюць. Аматары спрэчак. У той жа час яны адважныя, сваіх у бядзе не кінуць, абавязкова прыйдуць на дапамогу. Доўгажыхары, можа быць таму, што ўмеюць у жыцці прыстасоўвацца. Іх замкнёнасць, панурасць не адштурхваюць, а прыцягваюць да сябе, бо іх прымаюць за самавітых, надзейных людзей.
- Чамусьці лічылася, што людзі, народжаныя **ў сераду**, недаўгавечныя. Калі ж пры падтрымцы Нябёсаў, бацькоў і сваіх уласных сілаў пяройдуць небяспечную «мяжу свайго жыцця», то пражывуць доўга. Той, хто нарадзіўся ў сераду, як правіла, прыгожы, статны, самалюбівы, шчыры, валодае лёгкім норавам. Для сямейнай сувязі не бывае чалавека больш надзейнага. Пры ўсіх сваіх выдатных якасцях у душы яны нешчаслівыя і самотныя, але ўсё ж пакорліва нясуць свой крыж і кладуць жыццё на алтар сям'і.
- Людзі, народжаныя **ў чацвер**, маюць прыгожую знешнасць: светлы твар са здаровай чырванню, ясныя вочы. Галаву носяць з гонарам і годнасцю. Не просяць у доўг, лепш будуць галадаць, не распіхваюць іншых локцямі дзеля сваёй кар'еры, не чытаюць маралі. Народжаныя ў чацвер — сапраўдныя сябры, клапатлівыя бацькі і маці. Утульнасць і супакой шануюць больш за ўсё.
- Народжаныя **ў пятніцу** — добрыя, адкрытыя, творчыя людзі. Любяць музыку, літаратуру, спрабуюць пісаць самі, добра малююць, іграюць на музычных інструментах. Калі атрымоўваюць добрую адукацыю, то дасягаюць вызначаных вышыняў. Яны здольныя на гераічныя ўчынкі, але больш за ўсё ў іх развіта пачуццё спачування да слабых і бездапаможных.
- Народжаныя **ў суботу** меланхалічныя, некалькі ўзлаваныя, бурклівыя, аднак пасля выплеску гневу стараюцца хутчэй загладзіць сваю віну. Яны не супраць пажывіцца за чужы кошт, лічаць сябе вельмі разумнымі, таму рэдка слухаюць чужыя парады. Да старасці выглядаюць стройнымі, нават хударлявымі, не любяць апранацца ў новае, іх адрозніваем старамодная вопратка.
- Калі чалавек нарадзіўся **ў нядзелю**, то ў яго моцны Анёл-ахоўнік. Таму сярод народжаных у нядзелю шмат людзей са шчаслівым лёсам. Сярод іх больш за ўсё начальнікаў, навукоўцаў, палкаводцаў, музыкаў, мастакоў. Калі раптам яны цяжка захварэюць, то ў самы крытычны момант у іх адкрываецца другое дыханне. Сярод доўгажыхароў планеты — тыя, хто нарадзіўся ў нядзелю. Пра такіх казалі: «у яго руках жыве шчасце». Ім вераць, на іх спадзяюцца, ім ахвотна даюць у доўг, даруюць правіннасці.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2330. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12